У КОЛЬКІ АБЫХОДЗЯЦЦА «ХУТКІЯ ГРОШЫ» 14

ЯК РАЦЫЁН ШКОЛЬНІКА ЎПЛЫВАЕ НА АДЗНАКІ? Самейная школа

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ВЕРАСНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 171 (29793)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Для Беларусі гістарычна склалася так, што менавіта ў прамысловасці найбольш поўна ўвасоблены інтэлектуальны і інавацыйны патэнцыял нашых людзей. Рэалізоўваючы праекты ў рэальным сектары, мы не толькі выконваем даручэнне кіраўніка дзяржавы па стварэнні ў кожным раёне новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, але і гарантавана забяспечым фарміраванне або прасоўванне брэндаў рэгіёнаў. Такая сітуацыя адкрывае магчымасці па стварэнні новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў на аснове кампетэнцый і патэнцыялу, якія маюцца ў індустрыі малых гарадоў і раёнаў. Кіруючыся такім падыходам, мы дэталёва разгледзелі моцныя бакі кожнай тэрыторыі: сыравінная база, кадравыя рэзервы і наяўнасць уласных унікальных напрацовак. Прапанаваныя інвестыцыйныя ініцыятывы забяспечваюць такую ўзаемаўвязку існуючых магчымасцяў, якая надасць іх развіццю найбольш магутны сінергетычны эфект».

РАДАСЦЬ НОВЫХ АДКРЫЦЦЯЎ

Дарагія сябры!

Віншую вас з Днём ведаў.

Гэта свята ўсіх, хто 1 верасня пераступіў школьны парог, каб стаць бліжэй да сваіх мар, ажыццявіць якія дапамагаюць веды.

Сёння пачынаецца новы навучальны год, для кагосьці першы ў жыцці. Беларускія школы з вялікай цеплынёй сустракаюць першакласнікаў. Мы разам зрабілі ўсё, каб для малышоў і іх бацькоў гэты дзень стаў самым запамінальным і шчаслівым.

Студэнтам-першакурснікам, якім трэба будзе спасцігнуць азы будучай прафесіі, жадаю прайсці выбраны шлях дастойна і з максімальнай аддачай, здабыць неабходныя для рэалізацыі сваіх мэт кампетэнцыі і навыкі.

У гэты святочны дзень шчыра дзякую настаўнікам і выкладчыкам за такую важную работу і гатоўнасць аддаваць сябе без астатку нашым дзецям.

Няхай новы навучальны год прынясе ўсім вам радасць новых адкрыццяў і зносін, а ў сценах школ, каледжаў і ВНУ заўсёды пануе атмасфера імкнення да ведаў, узаемнай павагі і любові да нашай роднай Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

У СШ № 5 горада Навагрудка ўпершыню сядуць за парты Кірыл і Максім Каўкелі, а таксама Дамінік і Эмілія Мокаты. Дзеці захапляюцца спортам: Кірыл і Максім ходзяць на барацьбу, Дамінік будзе займацца футболам, Эмілія ж наведвае гімнастыку і танцы. А ў СШ № 4 сярод першакласнікаў — Таня і Софія Мурзічы ды Арцём і Ангеліна Патукі. Усе дзеці з нецярпеннем чакаюць знаёмства з аднакласнікамі і свой першы ўрок.

На здымках: Ангеліна Патук, Таня і Сафія Мурзічы, Арцём Патук; Дамінік і Эмілія Мокаты, Кірыл і Максім Каўкелі.

Фота БелТА.

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні Прэзідэнту Ісламскай Рэспублікі Пакістан Арыфу Алві ў сувязі з ахвярамі паводкі.**
- Больш за 700 аб'ектаў інфраструктуры ў Мінскай вобласці абсталююць элементамі безбар'ернага асяроддзя.

Класныя навіны

НАВУЧАЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ ЗМЯНІЛІСЯ КРОПКАВА

Што чакае школы з 1 верасня?

У новы навучальны год сістэма адукацыі нашай краіны ўступае з новай рэдакцыяй Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. У яе былі ўключаны змяненні, якія адбыліся за апошнія дзесяць гадоў. У дакумент унесена больш за 200 змяненняў і правак, уключана 17 новых артыкулаў (усяго іх 297). Асноўнае новаўвядзенне Кодэкса — абавязковая агульная сярэдняя адукацыя. У мінулай рэдакцыі абавязковай была базавая адукацыя. Агульную сярэднюю адукацыю можна будзе атрымаць як у школе, так і паралельна з атрыманнем прафесіі ў каледжы. Акрамя таго, новай рэдакцыяй вызначана інклюзіўная адукацыя, якая прадугледжвае асобную работу па стварэнні ўсіх неабходных умоў не толькі для падтрымкі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і іх навучання, але і для атрымання імі прафесіі з наступнай сацыялізацыяй.

СТАР. 4

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ ПРАВЁЎ ШЭРАГ ТЭЛЕФОННЫХ РАЗМОЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30—31 жніўня правёў шэраг тэлефонных размоў. З Прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым перш за ўсё абмеркавалі актуальныя пытанні беларуска-азербайджанскіх двухбаковых адносін. Таксама лідары абмяняліся думкамі і па тэматыцы міжнароднага парадку дня. Галоўнай тэмай размовы з Прэзідэнтам Узбекістана стаў саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, які адбудзецца ў сярэдзіне верасня. Беларускі лідар плануе ўзяць удзел у дадзеным мерапрыемстве. Аб развіцці беларуска-ўзбекскага ўзаемадзеяння Аляксандр Лукашэнка і Шаўкат Мірзіёеў гаварылі як у разрэзе двухбаковага супрацоўніцтва, так і разглядалі яго праз прызму ўзаемадзеяння ў інтэграцыйных структурах.

Будучы саміт ШАС ва Узбекістане Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў і са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Прэзідэнты дамовіліся правесці сустрэчу на палях ШАС. Таксама лідары дзвюх краін абмеркавалі графік далейшых кантактаў. Разгледзелі ў тым ліку беларуска-расійскія адносіны, найбольш актуальныя пытанні і сітуацыю ў рэгіёне і свеце.

Акрамя таго, беларускі лідар правёў тэлефонную размову з першым Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Датычылася яна і беларуска-казахстанскіх адносін, і міжнароднага парадку дня. Адбылася таксама тэлефонная размова са Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянцінай Мацвіенкай.

Валерыя СЦЯЦКО.

«ВЫ СВЯДОМА ВЫБРАЛІ СВОЙ ШЛЯХ»

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўручыў учора дзяржаўныя ўзнагароды шэрагу супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў. «Краіна па заслугах ацаніла праяўленыя вамі мужнасць, вытрымку, прафесіяналізм, стойкасць і здольнасць вырашаць найважнейшыя баявыя задачы. Вы ўнеслі вялікі ўклад у забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, абарону канстытуцыйнага ладу, ахову грамадскага парадку, правоў і законных інтарэсаў грамадзян нашай краіны», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, сярод узнагароджаных супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі людзі розных воінскіх прафесій, званняў, але іх усіх аб'ядноўвае неабыякавасць, стойкасць і гатоўнасць у самы востры момант устаць на абарону Радзімы.

«Вы свядома выбралі свой шлях, здольныя пераносіць высокія псіхалагічныя і фізічныя нагрузкі, не адступаць перад цяжкасцямі, быць вернымі прысязе, чэсна служыць інтарэсам нашай Радзімы. Я ўпэўнены, што для вашых падраздзяленняў, часцей вы з'яўляецеся прыкладам. Вашы калегі, маладзейшыя супрацоўнікі, будуць раўняцца на вас і таксама пры неабходнасці будуць гатовыя праявіць самыя лепшыя чалавечыя і службовыя якасці», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Раман Галоўчанка павіншаваў герояў дня з узнагародамі. Ён выказаў упэўненасць, што гэта стане яшчэ адной матывацыяй, стымулам для прадаўжэння сумленнай і самаадданай работы ў інтарэсах краіны і грамадзян. «І, вядома ж, у вашай асобе дзякую ўсім супрацоўнікам органаў унутраных спраў за тую службу, якую вы з гонарам несяце», — сказаў прэм'ер-міністр.

Валерыя СЦЯЦКО.

«ПАКУЛЬ ПОМНІМ КОЖНАГА З ЗАГІНУЛЫХ, МЫ БУДЗЕМ НЕПЕРАМОЖНЫЯ»

Ва ўрочышчы Іванаўшчына Лагойскага раёна адбылося перапахаванне астанкаў мірных жыхароў, расстраляных фашыстамі і іх памагатымі ў 1941 годзе. Падчас раскопак, якія вяліся з 26 красавіка да 28 ліпеня, было выяўлена і вынята больш як 1020 косцевых астанкаў.

Як расказала **дырэктар Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея Святлана ГАМЕЗА**, 30 жніўня 1941-га ва ўрочышчы Іванаўшчына знішчаны мірныя яўрэі і людзі іншых нацыянальнасцяў. Звыш тысячы чалавек. Лагойск у тыя часы быў яўрэйскім мястэчкам. З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў тут усталяваўся новы парадак — акупацыйны рэжым. Адразу ж мясцовым жыхарам забаранілі выходзіць з дому, некуды ехаць. А 28 жніўня іх прымусілі рыць нібыта акопы, людзі не здагадваліся, што самі сабе капаюць магілу. 30 жніўня сюды сагналі лагойскіх яўрэяў і яўрэяў з мястэчка Гайнаўка і расстралялі.

Некаторым удалося выратавацца, сярод іх быў цырульнік. Пра гэта расказалі яго пляменнікі Навум і Якаў Касоўскія, якія пасля вайны ўстанавілі памятную пліту крыху вышэй за месца знішчэння мірных грамадзян. Калі іх дзядзька зразумеў, што тут будзе адбывацца, ён крыкнуў: «Дзеці, ратуйцеся!» і паласнуў паліцаю па горле небяспечнай брытвай. Усе кінуліся ўрассыпную. Непадалёку пасвіўся статак кароў, жанчыны, дзеці сталі хавацца за жывёлінамі. Большасць тых, каму ўдалося ўцячы, фашысты злавілі і пазней расстралялі каля палаца Тышкевічаў у парку. Браты Навум і Якаў хаваліся да вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на адным з хутароў, днём туліліся ў пограбе, а ноччу дапамагалі сваім выратавальнікам па гаспадарцы. Пра гэта расказаў Святлане Гамезе іх пляменнік Міхаіл Касоўскі, які жыве ў Брукліне і з якім яна перапісвалася ў сацыяльных сетках. Міхаіл уладкаваў па месцы свайго жыхарства невялікі мемарыяльны комплекс, пасадзіў алею ў гонар загінулых сваякоў.

Фота БелТА.

Усяго ж на Лагойшчыне налічваецца каля дваццаці месцаў пахавання мірных жыхароў, якія былі знішчаны за гады акупацыйнага рэжыму.

У жалобнай цырымоніі перапахавання ахвяр фашызму ўзялі ўдзел **Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Андрэй ШВЕД і старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**.

— Мы, беларусы, мірныя людзі, міралюбівая нацыя, мы не хочам вайны, абавязаныя не дапусціць тое, што адбывалася на нашай зямлі 80 гадоў таму. Сёння нашчадкі тых, хто чыніў зверствы на нашай зямлі, ніяк не супакоясца, прымаючы новыя вытанчаныя формы барацьбы з нашай дзяржавай — эканамічныя санкцыі, розныя абмежаванні, з дапамогай якіх хочуць дабіцца разбурэння Беларусі. Лічу, што ўвекавечваючы памяць загінулых, мы даказваем усяму свету, што нас не зламаць. Пакуль помнім кожнага з загінулых, мы будзем моцныя, цвёрдыя і паспяховыя як грамадзяне незалежнай дзяржавы, — сказаў Аляксандр Турчын.

Андрэй Швед падкрэсліў, што работа па выяўленні фактаў генацыду беларускага народа вядзецца кожны дзень, працуе вялікая следчая група, дапамагаюць калегі з Міністэрства абароны, 52-гі пошукавы батальён, Следчы камітэт, Камітэт судовых экспертыз, органы дзяржаўнай і выканаўчай улады. Толькі за мінулы год разгледжана больш як 400 раней невядомых або малавывучаных месцаў масавага знішчэння мірных грамадзян і савецкіх ваеннапалонных, на сённяшні дзень дапытана амаль 15 тысяч чалавек. «Мы накіравалі запыты аб аказанні прававой дапамогі ў дзевятнаццаць краін свету, дзе да гэтага часу пражываюць фашысцкія каты, карнікі, — канстатаваў генпракурор.

Андрэй Швед паведаміў, што ёсць краіны, дзе беларусам адмовілі ў супрацоўніцтве па раскрыцці фактаў генацыду — Латвія, Польшча, Літва. Тыя краіны, якія ўсведамляюць небяспеку фашызму, ахвотна ідуць на кантакты, у першую чаргу Расійская Федэрацыя. Вядзецца актыўная перапіска з краінамі Лацінскай Амерыкі па ўстанаўленні месцаў знаходжання жывых эсэсаўцаў, вырашэнні юрыдычных пытанняў аб іх адказнасці, перш за ўсё катаў латышскага батальёна СС. «Германія па шэрагу момантаў уступіла з намі ў перапіску, мы атрымліваем некаторыя дакументы. На жаль, гэта не дзяржаўныя фонды, установы.

Паніхіду па загінулых здзейснілі праваслаўны і каталіцкі святары і рабін.

Падчас жалобнай цырымоніі ў гонар бязвінных ахвяр вайны ва ўрочышчы адкрыты памятны знак.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Па сутнасці

ГРАМАДЗЯНЕ КРАІНЫ ВЕДАЎ

Дрэнныя звычкі, лішняя вага, нецікавае жыццё... Ад гэтых мяхоў жыццёвага смецця мы заўжды пазбаўляемся кожны новы панядзелак альбо кожны Новы год. Але кожны панядзелак аказваецца цяжкім, а перад кожным Новым годам у нас хапае сіл толькі на тое, каб навесці чысціню і прыгатаваць як мага больш страў. А пасля навагодняй ночы сіл нестае нават вылазіць з-пад цёплай і ўтульнай коўдры. Так вось і «прасыпаем» жыццё. Адкладваючы ўсё на потым. Але ёсць справы, якія «на потым» ні ў якім разе не трэба адкладваць. Гэта адукацыя і выхаванне. Некалі нашы продкі адзначалі Новы год у пачатку вясны, затым — восені... Сёння, у першы дзень верасня, таксама вельмі важнае свята — першы дзень новага навучальнага года. І калі пастарацца зрабіць нашу школу, звычайную і ўніверсітэтскую, лепшай, як не 1 верасня?..

Гэтыя дні — шчаслівы сум. Вось і лета прайшло, але наперадзе — сустрэчы. З Яе Вялікасцю Краінай Ведаў, з сябрамі альбо новымі паплечнікамі ў выглядзе аднакласнікаў і аднакурснікаў. Для многіх з іх наогул — пашырэнне геаграфічнага асяроддзя, адкрыццё новых мясцін, з'яў, падзей. Класы і аўдыторыі з водарам свежасці. Раней гэта былі пафарбаныя парты і падлога, цяпер усё «ўпакавана» ў сучасныя будаўнічыя матэрыялы. Бездакорная чысціня. Але ці заўважаць тое грамадзяне Краіны Ведаў? І мо добра было б, калі б яны, няўрымслівыя, насіліся па калідорах. Не. Цяпер усе захопленыя вірлівым інтэрнэтам. Ён іх адукоўвае і выхоўвае. Вось яна, першая праблема адукацыі. Сёння час інфармацыі розных хуткасцяў. Пакуль старанны настаўнік раскажа пра Бацьку Міная, Грыцаўца альбо маршала Ракасоўскага, інтэрнэт-бруд ужо запэцкае дзіцячую свядомасць фактамі аб зорна-паласатых пераможцах у Другой сусветнай вайне. Нават у камп'ютарных «стралялках» — зручней гуляць за саюзнікаў. Бо ў іх лепшы зброевы арсенал, чым у нашых. Дарэчы, а чаму яшчэ не створана гульня па матывах аперацыі «Багравіён», аб НАШАЙ Перамозе?

Дарэчы, айці-сферу я наўмысна закрануў. Мы ёю ганарымся. Наш інтэлектуальны брэнд. Сучасная і новая кампетэнцыя. Маўляў, лічбавых прафесіяналаў пачынаюць ствараюць ці не з дзіцячага садка. З аднаго боку, добра. Толькі з аднаго. Аднабаковае развіццё атрымліваецца. Усё на 3D-прынтары не надрукуеш і заводы ў графічным рэдактары не намалюеш, ды і лячыць людзей і абараняць краіну робаты пакуль няздольныя. Пакуль яны толькі на выставах і найлепш за ўсё падыходзяць для сэлфі. Нават калі мы рабатызуем нашу эканоміку, кіраваць ёю ўсё ж будуць людзі. А людзі павінны ўсведамляць сябе не толькі прыналежнымі да нейкай прафесіянальнай кагорты альбо той ці іншай карпарацыі. Усё гэта акалічнасці лібералізму і капіталізму. Галоўнае ў іншым: мы — адзіны народ. Беларусы. Вось каго павінна выхоўваць сучасная школа. Грамадзян краіны. Вядома, матэматыкаў, біёлагаў, абавязкова — мехатронікаў. Але галоўнае — БЕЛАРУСАЎ. Бо раней тое, з чым не паспявала школа, бралі на сябе кнігі і тэлебачанне. Цяпер кніг не чытаюць. Цяпер «інфу» праглядаюць. І дарэчы, чым карацей — тым лепш. Час шотавага ўспрымання. А што датычыцца тэлебачання, то яно занятае рэйтынгамі. Калі ў школе не растлумачаць, чаму Дастаеўскі лепшы за Маргенштэрна — гарманічных асоб будзе ўсе меней і меней.

Трэба разумець: геніяльны матэматык, які не ведае, чым адрозніваецца Здольнік ад Знасіловіча, чаму трэба з'ездзіць у Сынкавічы, і не будзе ганарыцца краінай-заснавальніцай ААН, — будзе Фаўстам.

Памятаеце, як некаторыя эксперты ўзрушана захапляліся Балонскай сістэмай? Гэта, маўляў, — панацэя для нашай эканомікі: мы рыхтуем вузканакіраваных спецыялістаў, яны змогуць працаваць па ўсім свеце. Але ў чым тут праблема? Па-першае, чалавек будзе зашораны. Глядзець на свет пад адным вуглом. Мне здаецца, геніяльны кардыёхірург павінен быць знаёмы і з мастацкім вобразам рамана «Сэрца на далоні». Па-другое, атрымаюць дзеці Беларусі выдатныя веды і разляцяцца, нібы тыя птушкі, па свеце. У пошуках вялікіх заробкаў. Бо Беларусь ніколі не ўзбагачалася за кошт галоднай Афрыкі і ўкрадзенай нафты. Ды і грошы мы не друкуем. Балонская сістэма — гэта стратэгічнае вымыванне мазгоў, вынішчэнне і гуманітарныя рэпрэсіі супраць інтэлекту нацыі.

А што было дрэннага ў савецкай мадэлі адукацыі? Забыліся на яе, нібы разгульны коўч-менеджар на сваю вясковую маці. Я не кажу цяпер пра змест. Я пра форму. Па змесце шмат пытанняў. Хто для нас, напрыклад, быў Каліноўскі? «Свой» хлапец для тутэйшага селяніна альбо польскі нацыяналіст, кіраўнік тагачаснага «Азова»...

Бо ад колеру школьнай сукенкі не надта залежыць, пад якім сцягам праз колькі гадоў пойдзе сучасная школьніца на выбары Прэзідэнта. Гэта залежаць ад ведаў, што паселяцца ў яе чыстай душы.

Бо калі з фізіка і лірыка не выхаваць грамадзяніна, яго выхавае інтэрнэт-асяроддзе. Тыя, у каго кнопка ад віртуальнай павуціны. Яны добра прызвычаіліся націскаць на чалавецтва. Націскаць, як ім трэба. І атрымліваецца асабліва з тымі людзьмі, што вывучалі вузкія спецыяльнасці. Мяне вось што здзівіла. Чаму ў англасаксонскай мадэлі адукацыі такія «лішнія» веды па паліталогіі набываюць толькі дзеці палітычнай эліты гэтых багатых краін? А іншыя — хай сабе гуляюць у бейсбол, а не лезуць у палітыку. Ну, або назіраюць у месенджарах за жыццём і дзейнасцю лідараў сваіх думак.

Я добра памятаю папярэджанне прафесара Акадэміі кіравання — бацькі падручніка па ідэалогі: калі мы скароцім вывучэнне палітычных дысцыплін, то на плошчы Незалежнасці мы атрымаем свой Тахрыр. Прафесар памыліўся. На некалькі кіламетраў. Тахрыр мы атрымалі каля Стэлы, каля ГЦ «Рыга», на вуліцы Прытыцкага...

Памылкі настаўніка, асабліва школьнага настаўніка гісторыі, вельмі дорага каштуюць. Часам — для ўсёй краіны. Але ў нашай самастойнай краіне сёння — свята. Свята ведаў. Наперадзе ў кожнага з нас і ва ўсіх нас з вамі разам — шмат скрыжаванняў. Галоўнае, каб былі побач тыя Лабановічы, што дапамаглі б нам выбраць правільны шлях...

Яўген ПУСТАВОЙ.

«НЕАБХОДНА ПРЫМАЦЬ КАНКРЭТНЫЯ МЕРЫ»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытанні функцыянавання ААТ «Мотавела»

Наталля Качанава адзначыла, што не так даўно Прэзідэнт наведваў мотавелазавод, а яшчэ раней пры наведванні гэтага ж прадпрыемства Мінскаму гарвыканкаму была пастаўлена задача навесці там парадак, задзейнічаць нявыкарыстаныя плошчы і наладзіць эфектыўную работу самога прадпрыемства.

«На гэты раз пры наведванні была зроблена сур'ёзная заўвага: прадпрыемства — гэта практычна зборачная вытворчасць, якая з імпартных камплектуючых збірае веласіпеды, матацыклы. Па сутнасці, нізкі працэнт лакалізацыі вытворчасці», — звярнула ўвагу спікер.

Старшыня Савета Рэспублікі паведаміла, што рыхтуецца адпаведны пратакол даручэнняў, аднак ужо цяпер неабходна прымаць канкрэтныя меры. Кіраўнік дзяржавы дакладна назначыў тэрміны: да 1 студзеня 2023 года трэба прадэманстраваць, якая прадукцыя будзе выпускацца, які будзе ўзровень лакалізацыі.

Наталля Качанава адзначыла, што на сённяшняй нарадзе зацікаўленыя абмяркуюць прамежкавыя вынікі. Спікер падкрэсліла, што часу да снежня 2022 года, калі неабходна даць справаздачу кіраўніку дзяржавы, застаецца няшмат.

«Я ведаю, што гэта пытанне знаходзіцца на кантролі ва ўрадзе, гарвыканкаме. Сёння хацела б пачуць аб тых напрацоўках, якія ўжо ёсць», — адзначыла спікер.

Арына КАРПОВІЧ.

Нашы дзеці

У ШКОЛУ — З ДОБРЫМ СЭРЦАМ

Сёння па ўсёй краіне звоняць тысячы школьных званкоў, запрашаючы хлопчыкаў і дзяўчынак у цікавы свет ведаў. Але падрыхтавацца да школы — справа нялёгкая, таму ў шматдзетныя сем'і з падарункамі прыходзяць нераўнадушныя людзі.

Віншаванні прымае сям'я НЕСЦЯРЭНКАЎ.

Да 1 верасня шмат клопату ў бацькоў: маленькім «чамучкам» неабходна прыдбаць і касцюмчык, і спартыўную форму, выбраць падыходзячы ранец, зручны і прыгожы абутак. А яшчэ — запоўніць заплечнік шматлікімі сшыткамі, каляровымі алоўкамі і ручкамі. Для першакласнікаў гэты спіс значна павялічваецца: фарбы, пластылін, каляровая папера і кардон... І заўсёды непаседам не хапае гэтых матэрыялаў для палёту дзіцячай фантазіі. У рамках рэспубліканскай акцыі «Збяром партфель разам» прадстаўнікі грамадскасці наведваюць сем'і, якім патрэбная дапамога, і, як чараўнікі, дораць дзецям маленькае свята.

Сёлета да сям'і Несцярэнкаў з вёскі Ліпаўцы Віцебскага раёна завіталі **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ірына ПАЛЯКОВА** і **старшыня Віцебскай раённай арганізацыі прафсаюза работнікаў АПК Таццяна ДЗІКАНАВА.**

Бацька Дзмітрый працуе трактарыстам-машыністам сельскагаспадарчай вытворчасці СУП «Ліпаўцы» і цяпер амаль не бывае дома — заняты на жніве. Надзейны тыл мужу дома стварае жонка Кацярына, клапоціцца аб траіх дзетках: старэйшы Антон упершыню сёння пераступіць школьны парог, Назар наведвае дзіцячы садок, а малодшай Эльвіры ў пачатку жніўня споўніўся год. Пакуль бацька заняты на палях, маладой маці на дапамогу прыходзіць бабуля. Кожны дзень — у вірлівым карагодзе хатніх спраў і звонкіх дзіцячых галасоў.

«Нам прыемна павіншаваць вашу сям'ю з новым вучэбным годам. Для дзяцей гэта — яшчэ адзін крок у дарослае жыццё, для бацькоў — адказны і складаны перыяд. Жадаю вам выхаваць дастойных грамадзян нашай краіны, гэта атрымаецца абавязкова — перад дзіцячымі вачыма прыклад бацькі», — павіншавала Ірына Міхайлаўна і ўручыла каляровы набор канцылярыі.

Усяго ў рамках рэспубліканскай акцыі дэпутат з падарункамі наведала тры шматдзетныя сям'і ў Віцебскай, Шумілінскай і Гарадоцкай выбарчых акругах.

Да цёплых пажаданняў далучылася і прафсаюзны лідар аграрыяў раёна, адзначыўшы, што сем'ям людзей, занятых у сельскай гаспадарцы, галіновая арганізацыя аказвае дапамогу невыпадкова: праца на зямлі — цяжкая і адказная, механізатарам, асабліва ў гарачы сезон, не хапае часу на штодзённыя клопаты, таму сваё плячо падстаўляе прафсаюз.

Антон з радасцю азнаёміўся са змесцівам падарунка, абацяюча абавязкова падзяліцца з братам. А на пытанне, ці хочацца хлопчыку хутчэй сесці за першую ў жыцці школьную парту, з натхненнем адказаў: «Вельмі!»

Напярэдадні свята першага званка шчырыя віншаванні прымалі выхаванцы сацыяльна-педагагічнага цэнтра Віцебскага раёна. Цяпер у ім знаходзяцца восем дзетак ва ўзросце ад трох да 18 гадоў, якія трапілі ў складаныя сямейныя абставіны. Самыя маленькія наведваюць дзіцячы садок, школьнікі — мясцовую Старасельскую школу. Выхаванцам уручылі падарункі ад аддзела па адукацыі райвыканкама, раённых прафсаюзаў, абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы, упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС па Віцебскай вобласці. А яшчэ сюрпрыз для школьнікаў падрыхтавала абласная ДАІ — яны разгарнулі на тэрыторыі цэнтра інтэрактыўную пляцоўку з гульнямі, квэстамі і падарункамі. Дзеці, у сваю чаргу, падрыхтавалі для гасцей святочны канцэрт.

Для Кіры сённяшні школьны званок празвініць у другі раз, для яе сябра Ягора — у трэці. Дзяўчынка родам з Ноўкі, хлопчык — з Шапуроў, але так склаліся абставіны, што сядуць за парту яны ў Старым Сяле. З Кірай у цэнтры жывуць сястрычка Нэлі і брацік Даня, з Ягорам — старэйшая сястра Мілана, яна ўжо выпускніца.

Будзем спадзявацца, што яшчэ адзін школьны год прынясе дзецям толькі станоўчыя эмоцыі, шчырых сяброў і неабходныя ў жыцці веды.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Добрыя навіны

БАЗАВАЯ СТАЎКА ПАВЫСІЛАСЯ

Вырастуць і зарплаты бюджэтнікаў

У сувязі з павышэннем базавай стаўкі з 1 верасня зарплата бюджэтнікаў павысіцца. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

З 1 верасня бягучага года памер базавай стаўкі складае 211 рублёў, а з 1 лістапада — 212 рублёў.

— У выніку сярэднегадавы памер базавай стаўкі ў 2022 годзе складзе 209,8 рубля, што ў параўнанні да мінулага года больш на 6,9 %, — расказалі ў міністэрстве.

Паколькі да базавай стаўкі прывязаныя іншыя стымулюючыя і кампенсуючыя выплаты, у лістападзе павелічэнне зарплаты за кошт росту базавай стаўкі складзе ад 5 да 30 рублёў, а ў сярэднім — каля 12 рублёў.

Нагадаем, што ў 2022 годзе працягваецца паэтапны рост заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы за кошт павелічэння базавай стаўкі. У першым паўгоддзі гэтага года базавая стаўка павышана са 198 да 210 рублёў — на 6 %.

Як і планавалася раней, урадам прынята рашэнне аб чарговым этапе павышэння базавай стаўкі з верасня. На павышэнне базавай стаўкі з бюджэту будзе накіравана каля 59 мільёнаў рублёў.

Алена КРАВЕЦ.

Грашовая прыбаўка — у «дашкольнікаў»

З 1 верасня заробкі ў выхавальнікаў установ дашкольнай адукацыі і іх памочнікаў павялічацца.

Пастановай Міністэрства адукацыі ад 23 жніўня 2022 г. № 280 устанаўліваюцца надбаўкі за работу ў галіне: у памеры 20 працэнтаў ад акладу — выхавацелям дашкольнай адукацыі і ў памеры 10 працэнтаў ад акладу — памочнікам выхавальнікаў ва ўстановах, якія ажыццяўляюць адукацыйныя праграмы дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

Не сакрэт, што адзін з паказчыкаў прэстыжнасці работы ў галіне — узровень аплаты працы яе работнікаў. Па выніках студзеня — чэрвеня суаднесіны сярэднямесячнай заработнай платы ў адукацыі склалі 70,5 працэнта да гэтага паказчыка па краіне. У педагагічных работнікаў — 82,3 працэнта, у тым ліку ў настаўнікаў — 89,6 працэнта і ў выхавальнікаў дашкольнай адукацыі — 63,1 працэнта. Як відаць, найбольш востра пытанне з аплатай працы стаіць менавіта ў сістэме дашкольнай адукацыі. Але з новага навучальнага года заробкі і на гэтым узроўні адукацыі павысяцца...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Лічбавы свет

НОВАЯ МАГЧЫМАСЦЬ ID-КАРТКІ — атрыбутны сертыфікат у любы час

Беларусы, якія атрымалі новыя пашпарты, дзе рэалізавана магчымасць электроннага лічбавага подпісу, з дапамогай якога можна не толькі ідэнтыфікаваць сябе анлайн, але і здзейсніць розныя працэдуры, ужо ацанілі яе функцыянал. А з нядаўняга часу ўладальнікі ID-картак могуць пацвярджаць свае паўнамоцтвы як уладальніка дакумента (з дапамогай атрыбутнага сертыфіката) аўтаматычна, а не штораз для кожнага дзеяння. Як гэта зрабіць і для чаго патрэбна, расказаў начальнік Рэспубліканскага цэнтра сведчання Уладзімір БАСЬКО.

ID-картка з'яўляецца не толькі афіцыйным дакументам, які сведчыць асобу, але і сродкам для здзяйснення юрыдычна значных дзеянняў у лічбавым свеце. І адзін са спосабаў пацвердзіць паўнамоцтвы ўладальніка дакумента — атрыбутны сертыфікат, расказаў спецыяліст:

— Атрыбутны сертыфікат — гэта электронны дакумент, які выдаецца ў Беларусі даверанымі пастаўшчыкамі паслуг (Рэспубліканскім цэнтрам сведчання) і ўтрымлівае інфармацыю аб паўнамоцтвах асобы, якая валодае асабістым ключом электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП), на падпісанне пэўных відаў электронных дакументаў, а таксама іншых паўнамоцтваў, якія дадзены яму ад імя арганізацыі, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка.

Раней уладальніку інфармацыйнай сістэмы, дзе адбываліся юрыдычна значныя дзеянні, для работы з атрыбутным сертыфікатам неабходна было атрымаць яго непасрэдна ад уладальніка ID-карткі. А ўладальнік, каб атрымаць атрыбутны сертыфікат, павінен быў папярэдне скачаць яго з воблачнага сховішча ў сецыве, выкарыстоўваючы ўнікальны логін і пароль (а іх яшчэ трэба ўспомніць ці адшукаць сярод паведамленняў у электроннай пошце), а пасля ўстанавіць атрыбутны сертыфікат на лакальным працоўным месцы ці серверы. Вядома, гэта было нязручна і займала пэўны час, падкрэсліў Уладзімір Басько:

— Новыя паслугі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП): 6.5.12 «Аказанне доступу да базы даных атрыбутных сертыфікатаў» і 6.5.13 «Аказанне доступу да базы даных атрыбутных сертыфікатаў для падпісчыкаў, якія маюць ліцэнзію на комплекс праграмных сродкаў прыкладной сістэмы (КПСПС)», дазваляюць спрасціць гэты працэс, паколькі патрэбны актуальны атрыбутны сертыфікат з базы даных цяпер аўтаматычна адпраўляецца ў інфармацыйную сістэму ў любы час. Абедзве паслугі можна атрымаць, калі звярнуцца з заявай у НЦЭП.

Першая паслуга (6.5.12) даступная ўсім карыстальнікам. Другая (6.5.13) — спажыўцам, якія раней атрымалі паслугу 122.3 «Выданне тэхналагічнага сертыфіката для КПСПС на адзін год з атрыманнем ліцэнзіі». Пры гэтым доступ да базы даных атрыбутных сертыфікатаў даецца спажыўцу на тэрмін дзеяння атрыманай ліцэнзіі, удакладніў эксперт:

— Новыя паслугі аказваюцца ў аўтаматычным рэжыме па тэхналогіі «сістэма-сістэма», а атрыбутныя сертыфікаты даюцца па запыце, які ўтрымлівае серыйны нумар сертыфіката адкрытага ключа ЭЛП. Каб атрымаць паслугу, спажывец павінен спачатку рэалізаваць у сваёй інфармацыйнай сістэме АР-адрас для ўзаемадзеяння з базай даных атрыбутных сертыфікатаў, арганізаваць доступ да сеткі перадачы даных, заключыць дагавор на аказанне паслуг, арганізаваць абароненае злучэнне і атрымаць рэквізіты для настройкі сваёй інфармацыйнай сістэмы.

Здаецца, патрэбна шмат дзеянняў, затое пасля наладжвання схемы можна атрымліваць электронныя паслугі і не пацвярджаць штораз для кожнай працэдуры ў сецыве атрыбутны сертыфікат.

Ірына СІДАРОК.

НАВУЧАЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ ЗМЯНІЛІСЯ КРОПКАВА

ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ УРОКА

1 верасня за школьныя парты сядуць 115 тысяч першакласнікаў (летась іх было на тысячу менш). Агульная ж колькасць школьнікаў перавысіць 1 мільён 85 тысяч чалавек. Тэма першага ўрока ў Дзень ведаў — «У гістарычнай памяці сіла і адзінства беларускага народа».

Як расказала **начальнік управлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Ірына КАРЖОВА**, традыцыйным падарункам да новага навучальнага года стане адкрыццё ў краіне чатырох новых школ. Адна з іх (на 471 месца) адчыніць свае дзверы для дзяцей у Кобрыне. Школа на 321 месца рыхтуецца да адкрыцця ў Століне. Таксама новая школа на 720 месцаў прыме дзяцей у Смалявічах. А ў Мінску з'явіцца школа, разлічаная на 1020 вучняў. Усяго ж у краіне будзе функцыянаваць 2901 дзяржаўная ўстанова адукацыі.

Для падвозу 53 тысяч навучэнцаў плануюць задзейнічаць 1,5 тысячы школьных аўтобусаў, у тым ліку 86 спецыяльна абсталяваных для навучэнцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

— Асаблівая ўвага ў гэтым навучальным годзе, як, дарэчы, і ў папярэднім, будзе аддавацца выхаваўчаму патэнцыялу ўрока. Мы гаворым, што кожны ўрок павінен не толькі несці веды па сваім прадмеце, але і выхоўваць навучэнцаў, — падкрэслівае Ірына Каржова. — Для гэтага Міністэрства адукацыі дае адпаведныя рэкамендацыі па асвятленні тых ці іншых тэм, напрыклад рэкамендацыі па асвятленні тэмы генацыду беларускага народа ў рамках выкладання розных навучальных прадметаў.

У 2021/2022 навучальным годзе завяршыўся пераход на абноўленыя навучальныя праграмы, які ахыццяўляўся паэтапна з 2015 года. «Таму ў новым навучальным годзе ніякіх карэнных змяненняў не адбудзецца, — запэўнівае начальнік упраўлення. — Навучальныя праграмы змяняліся кропкава, з улікам заўваг і прапаноў, якія паступалі ад педагогаў-практыкаў з месцаў. Акрамя таго, адбыліся змяненні ў Тыпавым вучэбным плане на 2022/2023 навучальны год».

Як прыклад, у новым навучальным годзе ў 10-х і 11-х класах павялічыцца колькасць гадзін на вывучэнне прадметаў «Беларуская мова» і «Руская мова». Калі раней навучэнцы на старшай ступені школы вывучалі беларускую і рускую мовы па гадзіне ў тыдзень, то цяпер у адным з паўгоддзяў у вучняў будуць два ўрокі беларускай і адзін — рускай, а ў другім паўгоддзі — наадварот. Профільныя класы гэта не закране. А вось колькасць гадзін, што адводзяцца на вывучэнне прадмета «Замежная мова», зменшыцца на старшай ступені школы на гадзіну ў тыдзень.

Яшчэ адно змяненне звязана з уступленнем у дзеянне новай рэдакцыі Канстытуцыі Беларусі: у навучальныя праграмы па гісторыі Беларусі і грамадазнаўстве былі ўнесены карэкціроўкі, якія прадугледжваюць вывучэнне змяненняў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Лізаветы ГОЛАД.

і дапаўненняў, прынятых на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года.

Зменяцца пералік і форма здачы выпускных іспытаў. Так, адзінаццацікласнікі ў сярэдзіне мая будуць здаваць цэнтралізаваны экзамен па беларускай ці рускай мове (на выбар) і матэматыцы. Для гэтага на базе ўстаноў адукацыі адкрыюць больш за 100 спецыяльных пунктаў. Школьнікаў туды будуць дастаўляць арганізавана. Кантраляваць працэс і апрацоўваць вынікі будзе Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, які займаецца правядзеннем у краіне цэнтралізаванага тэсціравання.

ЗАПРАШАЮЦЬ ФАКУЛЬТАТЫВЫ...

З 1 верасня беларускіх школьнікаў чакаюць новыя факультатывы, распрацаваныя Міністэрствам адукацыі. Цяпер іх дазволена праводзіць і па суботах. Сярод іх — вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Міжпрадметныя грані матэматыкі» для навучэнцаў восьмых—адзінаццатых класаў і факультатыў «У свеце тэхнікі і тэхналогій: выбіраем інжынерную прафесію» (па вучэбных прадметах «Інфарматыка», «Фізіка», «Геаграфія», «Матэматыка», «Хімія», «Біялогія») для старшакласнікаў. У рамках апошняга факультатыву навучэнцаў будуць знаёміць з гісторыяй узнікнення і развіцця прамысловасці, тэхналогіямі аўтамабіле-, прыбора- і машынабудавання. Раскажуць, як развіваюцца такія галіны, як энергетыка, металургія, архітэктура і будаўніцтва, праінфармуюць, што новага ў прыродакарыстанні і ахове навакольнага асяроддзя...

Таксама Міністэрства адукацыі зацвердзіла праграму новага факультатыву пад назвай «Мой псіхалагічны дабрабыт і дапамога аднагодкам у крызіснай сітуацыі». Факультатыў, у першую чаргу, накіраваны на тое, каб даць падлеткам магчымасць вывучыць сябе, сваю асобу, прапрацаваць навыкі самадапамогі, навучыцца аказваць пасільную дапамогу сябрам.

Падчас заняткаў школьнікі даведаюцца, што такое псіхічнае здароўе, як перамагчы стрэс, у чым выяўляецца крызіс і як яго пераадолець, як устанавіць асабістыя межы, як навучыцца думаць пазітыўна, што такое асобасны рост і яшчэ шмат важных рэчаў.

Нараўне з традыцыйнымі метадамі навучання на новых факультатывах будуць задзейнічаны кейс-тэхналогіі, метад праектаў, дыскусіі, гульнявыя метады, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, патэнцыял адукацыйных экскурсій, выязных заняткаў, анлайн-семінараў і вэбінараў.

Акрамя таго, быў распрацаваны і працяг вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Асновы духоўна-маральнай культуры і патрыятызму» для шостага (сёмага) класа. Яе змест грунтуецца на ўзаемадзеянні ўстаноў адукацыі з Царквой. У цэнтры ўвагі — выхаванне маральна сталай, духоўна развітой асобы, здольнай усведамляць адказнасць за лёс сваёй Айчыны, усведамленне значэння Царквы як найважнейшага сацыяльнага інстытута.

> Новы Кодэкс аб адукацыі прадугледжвае конкурсны адбор у 10-я класы гімназій. Ён будзе ажыццяўляцца па сярэднім бале пасведчання аб агульнай базавай адукацыі і адзнак прадметаў, якія навучэнцы будуць вывучаць на павышаным узроўні.

У школы вяртаецца дапрофільная падрыхтоўка, гэта значыць на ўзроўні 8-9-га класаў ва ўсіх школах дырэктары змогуць фарміраваць дапрофільныя класы. Гэта неабходна рабіць для таго, каб да моманту заканчэння 9-га класа маладыя людзі маглі або зрабіць выбар сваёй далейшай траекторыі навучання на ўзроўні каледжа, або працягваць навучанне на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі і рабіць усведамлены выбар профілю.

На старшай ступені школы паранейшаму будуць дзейнічаць профільныя класы з вывучэннем асобных дысцыплін на павышаным узроўні, профільныя класы прафесійнай накіраванасці (педагагічныя, спартыўна-педагагічныя, аграрныя, ваенна-патрыятычныя) і базавыя класы, вучні якіх будуць знаёміцца з прафесіямі рабочых (служачых). У абноўлены пералік увахо-дзіць больш як 80 прафесій: сярод іх пчаляр, пекар, пячнік, кухар, радыёмантажнік, аператар электроннага набору, садоўнік, фатограф, візажыст, афіцыянт і іншыя. Новы пералік ствараўся з улікам патрэб рынку працы ў рэгіёнах.

Што датычыцца ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, то ў бягучым годзе закупляецца абсталяванне для 230 кабінетаў працоўнага навучання і для 380 кабінетаў біялогіі.

Ірына Каржова заўважыла, што да выкарыстання ў адукацыйным працэсе будуць дапушчаны дзённікі навучэнцаў, распрацаваныя ў 2022 годзе. У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі ў іх былі абноўлены правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама пералік дзяржаўных свят і знамянальных дат. На форзацы дзённікаў размешчана рэклама Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ

У 2022—2023 годзе на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі будуць навучацца 60 тысяч чалавек і больш як 100 тысяч — на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Як расказала **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА**, у краіне будуць функцыянаваць 122 установы прафэхадукацыі, 110 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама іншыя ўстановы, якія рэалізоўваюць такія праграмы, напрыклад, філіялы ВНУ, гімназій-каледжы мастацтваў, філіялы Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі.

— Адзначу, што мы ўступаем у эру абноўленага Кодэкса аб адукацыі, таму ўводзіцца адзінае найменне для ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі — каледж. Гэта не значыць, што рэзка зменіцца структура падрыхтоўкі кадраў, у каледжах будуць рыхтаваць на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі кваліфікаваных рабочых і служачых, а таксама спецыялістаў сярэдняга звяна і рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. У прынцыпе, абедзве гэтыя траекторыі падрыхтоўкі кадраў запатрабаваныя эканомікай, — падкрэсліла Аляксандра Пятрова. — Змяненняў у змесце ў сувязі з перайменаваннем і пераходам на адзіны від — каледж — не плануецца, аднак установы адукацыі могуць пашырыць пералік праграм падрыхтоўкі ў адпаведнасці з патрэбамі рэгіёна і базавых арганізацый. Напрыклад, адкрыць падрыхтоўку рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Такія рабочыя вылучаюцца высокім узроўнем кваліфікацыі, іх падрыхтоўка накіравана на патрэбы высокатэхналагічных вытворчасцяў — там, дзе насамрэч патрэбныя рабочыя з высокім разрадам, якія могуць абслугоўваць найноўшае абсталяванне.

Змест адукацыйных праграм у прафесійнай школе змяняецца ў сувязі з тым, што змяняюцца тэхналогіі вытворчасці, патрабаванні да рабочага месца. Адпаведна, адбываецца абнаўленне вучэбна-праграмнай дакументацыі і адукацыйных стандартаў. Па словах Аляксандры Пятровай, толькі ў бягучым годзе былі абноўлены стандарты па 17 спецыяльнасцях прафесійна-тэхнічнай і 37 спецыяльнасцях сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Таксама з 1 верасня ўступае ў дзеянне новы Агульнадзяржаўны класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Новая рэдакцыя гэтага дакумента была прыведзена ў адпаведнасць з відамі эканамічнай дзейнасці, якія сёння існуюць. «Таму сёлета нас чакае маштабная распрацоўка вучэбна-праграмнай дакументацыі і адукацыйных стандартаў пад новы класіфікатар», — заўважыла Аляксандра Пятрова.

Яна дадала, што, акрамя лабараторый і вучэбных майстэрняў, у сістэме прафадукацыі функцыянуюць 52 рэсурсныя цэнтры. У новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі яны называюцца «цэнтрамі кампетэнцый». На сенняшні дзень праз іх прайшло ўжо больш як 27 тысяч чалавек.

Цэнтры кампетэнцый — гэта структурныя падраздзяленні ўстаноў адукацыі, аснашчаныя сучасным абсталяваннем, якое пастаянна абнаўляецца і якое немагчыма мець у кожнай установе адукацыі. У Кодэксе прапісана сеткавая форма ўзаемадзення пры рэалізацыі адукацыйных праграм, гэта значыць, усе навучэнцы профільных спецыяльнасцяў будуць мець доступ да матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбнай базы цэнтраў кампетэнцый і праходзіць там падрыхтоўку на найноўшым абсталяванні ў рамках, напрыклад, вучэбнай практыкі, вытворчага навучання, у рамках выканання лабараторных або практычных работ.

> Акрамя таго, на базе цэнтраў кампетэнцый вядзецца падрыхтоўка да рэспубліканскіх і міжнародных чэмпіянатаў прафесійнага майстэрства. Апошні рэспубліканскі чэмпіянат праходзіў у 2020 годзе па 47 кампетэнцыях. У яго фінале было прадстаўлена больш як 300 удзельнікаў.

«Увогуле, мы не плануем збаўляць тэмпы чэмпіянатнага руху, — запэўніла Аляксандра Пятрова, — паколькі, як паказала практыка, гэта матывуе нашых навучэнцаў, стымулюе інтарэс з боку школьнікаў працягнуць сваё навучанне ва ўстановах прафесійнай адукацыі, прыцягвае да сістэмы ўвагу не толькі патэнцыяльных навучэнцаў, але і заказчыкаў кадраў, якія разам з намі арганізоўваюць дадзеныя спаборніцтвы, вывучаюць стандарты сучасных інавацыйных вытворчасцяў. У верасні нас чакае Размеркаваны Еўразійскі чэмпіянат прафесійнага майстэрства ў Маскве і Саранску, мы будзем удзельнічаць у чэмпіянаце высокатэхналагічных галін прамысловасці ў Екацярынбургу, першым чэмпіянаце «Прафесіяналы» ў Санкт-Пецярбургу, першым чэмпіянаце высокіх тэхналогій у Вялікім Ноўгарадзе. А ў маі 2023 года адбудзецца ўжо пяты нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства, на які, па традыцыі, будуць запрошаны і ўдзельнікі з іншых краін».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Будзь у курсе!

Раней шмат пытанняў узнікала адносна таго, у якім узросце трэба прымаць дзяцей у першы клас. Цяпер першакласнікамі могуць стаць хлопчыкі і дзяўчынкі, якія дасягнулі шасцігадовага ўзросту да 1 верасня. Па заяве аднаго з законных прадстаўнікоў вучня пачаць навучанне ў школе можа дзіця, якому 6 гадоў спаўняецца з 1 да 30 верасня. Варта адзначыць, што згодна з новай рэдакцыяй Кодэкса кіраўнік установы адукацыі можа прыняць дзіця ў першы клас на падставе заявы аднаго з яго законных прадстаўнікоў і рашэння педагагічнага савета, калі будучаму вучню споўніцца 6 гадоў да канца каляндарнага года.

Сямейная газета

Выпуск № 14 (196)

НОВЫ ЭТАП У ЖЫЦЦІ

Ну хто, скажыце, гэтымі днямі не згадвае свой першы званок?! Першую настаўніцу, першых сяброў, першыя адзнакі?! Першыя радасці і расчараванні?!

Я пайшла ў першы клас у 1998 годзе. Сярод аднакласнікаў самая старэйшая — сямігодка. Праўда, знешне гэта было незаўважна — меншая ростам за многіх шасцігодак. Невыпадкова мяне, малую, бацькі не аддалі ў школу на год раней. Аднак была на тое яшчэ адна, больш сур'ёзная, прычына. У трохгадовым узросце ўрачы дыягнаставалі ў мяне касавокасць. Вочы трэба было берагчы. А яшчэ мама як магла спрабавала адгарадзіць мяне ад насмешак школьнікаў (заклеенае белым шкло ў акулярах па тым часе, асабліва ў вясковай школе, было рэдкасцю).

Сваіх аднакласнікаў я добра ведала — практычна з усімі хадзілі ў дзіцячы садок. З Дашай, з якой пасадзілі за адну парту, увогуле жылі ў адным доме, сябравалі з маленства. Дагэтуль — як сястрычкі, хоць і жывём у розных краінах. Увогуле, менавіта школа падарыла самых адданых сяброў. Яшчэ с дзвюма дзяўчатамі — Светай і Таняй — дагэтуль трымаем шчыльную сувязь, сябруем сем'ямі.

А ўсё пачалося з першага званка... І сёння памятаю, якія ўсе былі прыгожыя — белыя кашулі, чорныя сарафаны і касцюмы, белыя банты ў дзяўчат. Хваляваліся не толькі мы. Нашы бацькі адчувалі яшчэ больш яркія эмоцыі: у іх дзяцей пачынаўся новы этап у жыцці. Вельмі важны этап.

Урачыстасць праходзіла ў спартыўнай зале — менавіта яна ў вясковай школе магла змясціць такую колькасць людзей. Аднак перад гэтым — у класе — адбылося знаёмства з першай настаўніцай. Алену Віктараўну, вядома, мы ўсе ведалі. Яна жыла ў нашай вёсцы, у тым жа доме, што і мае бацькі. Маладая, прыгожая — яна хутка знайшла падыход да кожнага. Алена Віктараўна мела аб кожным з нас уяўленне — у маленькім населеным пункце ўсё як на далоні. Гэта цяпер, пераважна ў гарадскіх школах, настаўнікі з першага дня вывучаюць кожнага вучня як новую кнігу: знаёмяцца з бацькамі першакласніка, наведваюць месца яго пражывання, спрабуюць разабрацца ў здольнасцях кожнага вучня. У мой час пра тое, хто з вучняў на што варты, першы настаўнік ужо ведаў. І ніякіх падрыхтоўчых курсаў не было, каб пазнаёміцца з дзецьмі загадзя. У вёсцы, паўтаруся, усё як на далоні.

Я навучылася чытаць у пяць гадоў — за два гады да школы. І, як ні дзіўна, першыя ўрокі мне давала не маці, настаўніца пачатковых класаў. З алфавітам прыйшлося пасябраваць якраз у яе адсутнасць. Калі мама з'ехала на курсы павышэння кваліфікацыі, мяне «даверылі» бабулі, якая, таксама настаўніца па адукацыі, нічога лепшага не прыдумала, як вучыць мяне чытаць. Потым, вядома, мне гэта спатрэбілася: пакуль мае аднакласнікі толькі пачыналі асвойваць алфавіт, я ўжо была дзесьці пасярэдзіне Буквара (такая прывілея была дадзена настаўніцай).

Увогуле, бацькі са мной ніколі не мелі праблем. Адзнакі атрымлівала добрыя, урокі вучыла сама, правяраць за мной іх не было неабходнасці — адным словам, выдатніца. А яшчэ і актывістка. Ні адзін школьны канцэрт, конкурс (ці самадзейнасці, ці «Вучань года») не абыходзіўся без мяне. Самастойна з сяброўкамі-аднакласнікамі нават арганізоўвалі «Фабрыку зорак» па матывах папулярнага па тым часе музычнага праекта. Адным словам, ведалі, як павесяліцца і ў школе.

Аднак на першым месцы, вядома, была вучоба. Асабліва востра стаяла пытанне ў старшых класах. Трэба было паступаць. І разлічвалі мы толькі на школу. Рэпетытары тады толькі ўваходзілі ў моду. У нашай вёсцы іх увогуле не было, а займацца са спецыялістам у горадзе было дорага — мае бацькі столькі не зарабляліі. Таму разлічвала толькі на свае сілы. Ведала, што калі не паступлю на бюджэт, то платна мяне ніхто вучыць не будзе — не па сілах.

Дзякуй богу, настаўнікі ў нашай вясковай школе былі моцныя. Каб атрымаць свае 98 балаў на тэсціраванні па беларускай мове, хапіла школьных заняткаў і факультатыву. Вядома, было шмат і самастойнай працы. Дагэтуль памятаю, як вечарамі штудзіравала зборнікі тэставых заданняў з мінулых гадоў. Гісторыю, якую таксама даводзілася здаваць пры паступленні, вывучала на ўроках, дадаткова займалася і дома. А вось нядрэнна напісаць сачыненне — без яго і цяпер на журфак не паступіш — дапамаглі не нейкія там падрыхтоўчыя курсы, якія наведвалі ўсе мае будучыя аднагрупнікі, а ўдзел у алімпіядах па беларускай мове.

Аднак напярэдадні першага верасня згадваюцца не поспехі, не дасягненні. Згадваюцца першы званок, мае маленькія, нясмелыя аднакласнікі, прыгожая настаўніца, маладыя бацькі, вялізныя букеты простых кветак, якія ледзьве змяшчаліся ў руках будучых урачоў, хімікаў, праграмістаў, цырульнікаў, біёлагаў і журналістаў...

Вераніка КАНЮТА.

Мая дынастыя

Алеся КАЗАК:

«Я ХАЦЕЛА ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ»

Алеся КАЗАК са сваім бацькам Дзмітрыем Георгіевічам.

Капыльскі вопытны лясгас Мінскай вобласці размешчаны на тэрыторыі чатырох раёнаў: Капыльскага, Стаўбцоўскага, Нясвіжскага, Слуцкага. У складзе лясгаса — цэх дрэваапрацоўкі, лесапункт і пяць лясніцтваў. Адно з іх, Бабаўнянскае, узначальвае Алеся Дзмітрыеўна Казак. Яе кар'ера развівалася імкліва: у 2018 годзе выпускніца БДТУ прыйшла на пасаду памочніка ляснічага...

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Хуткая дапамога

ЁН ЗАЎСЁДЫ ПОБАЧ

Тэлефон даверу для падлеткаў як пасрэднік паміж імі і навакольнымі

Найбольш частыя пытанні, з якімі сучасныя дзеці і падлеткі звяртаюцца на «гарачую лінію», — праблемы ў стасунках. Іх хвалююць узаемаадносіны з аднагодкамі і супрацьлеглым полам, булінг у школе, канфлікты дома з бацькамі, зносіны ў інтэрнэце. Асноўная прычына ўсіх гэтых праблем — непаразуменне і няўменне выбудоўваць стасункі ў соцыуме. Прычым часта спрыяюць гэтаму і бацькі: хтосьці — празмернай апекай, а хтосьці — таму што быць бацькам проста не ўмее, бо гэтаму не вучаць, лічаць кансультанты дзіцячай тэлефоннай лініі. Сюды звоняць тыя, каму трэба тэрмінова расказаць пра сваю праблему, каму трэба выгаварыцца, — дзеці, якія пакутуюць ад адзіноты. У апошнія гады пачалі тэлефанаваць і больш дарослых, прычым не толькі бацькі, але і педагогі, трэнеры, якія перажываюць за сваіх гадаванцаў. Як і чым дапамагаюць спецыялісты тэлефону даверу?

Самакапанне — гэта добра

Дзіцячая тэлефонная лінія аказання дыстанцыйнай псіхалагічнай дапамогі ў экстранных выпадках (так поўнасцю называецца тэлефон даверу для падлеткаў) працуе ананімна і кругласутачна. Увогуле, нумароў два: **8 (017) 2630303 — сюды звяртаюцца па псіхалагічную падтрымку і суправаджэнне, 880111611 — нумар, скіраваны на дапамогу дзецям і падлеткам, якія пакутуюць ад эмацыянальнага ці фізічнага гвалту.** Расказаць пра небяспеку існавання такіх праяў у дачыненні да непаўналетніх могуць па гэтым нумары і дарослыя, а кансультанты сарыентуюць, куды можна звярнуцца па дапамогу.

Абедзве лініі працуюць пры Мінскім гарадскім клінічным цэнтры дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі, спецыялісты вядуць колькасны і якасны аналіз званкоў. Праблемы, з якімі звяртаюцца да спецыялістаў падлеткі, самыя розныя.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

ЁН ЗАЎСЁДЫ ПОБАЧ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Суіцыдальныя думкі, намеры і спробы; канфлікты ў сям'і; перажыванні з-за разводу бацькоў; зварот, якія патрабуюць абароны праваў дзіцяці; фізічны і эмацыянальны гвалт; пошук сяброў; цяжкасці ў стасунках з аднагодкамі; безадказнае каханне; цяжарнасць і праблемы ў сексуальнай сферы; злоўжыванне алкаголем ці наркотыкамі; праблемы ў вучобе; пытанні сацыяльнай адаптацыі і прыняцця сябе, — расказала **Вольга НАВУМЕНКАВА, загадчык псіхалагічнай лабараторыі Цэнтра дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі:**

— Аднак праз гады захоўваецца гэткая трыяда праблем: канфлікты ў сям'і, канфлікты з соцыумам, не вельмі добрае прыняцце самога сябе. Кожныя пяць гадоў падлеткі вельмі моцна «відазмяняюцца». Раней мы сваіх абанентаў больш накіроўвалі, каб яны прыйшлі да правільных высноў і дзеянняў. А цяпер часта падлеткі звоняць і расказваюць, што прайшлі навучанне на нейкіх курсах, былі на нейкім трэнінгу, займаліся на нейкай анлайн-платформе. Што яшчэ мы можам зрабіць? Так што сучасныя падлеткі разважлівыя і начытаныя, у іх у добрым сэнсе яскрава праяўляецца гэткі момант самакапання. Аднак ёсць і зваротны бок — хапае падлеткаў з залежнасцю ад гаджэтаў.

Дзеці (10—12 гадоў) доўга з кансультантам не размаўляюць — ім важна хутка расказаць пра сваю праблему. Падлеткі (15—16 гадоў) больш перажываюць за свае эмоцыі, расказваюць пра сваю мітусню, спробы. Часта, напрыклад, у дзяўчынак ва ўзросце гадоў 14, асабліва з перыферыі, узнікаюць праблемы з мамамі, падзялілася кансультант дзіцячай тэлефоннай лініі Марыя:

— Бацькі ціснуць на дзяцей, каб тыя вызначаліся з прафесіяй, кажуць, што трэба наймаць рэпетытара. А яны яшчэ не вызначыліся, яны хочуць пабыць дзецьмі, і такія патрабаванні па арганізацыі падрыхтоўчага этапу да вышэйшай адукацыі іх палохаюць. Часта падлеткі звоняць у дэпрэсіўным стане і закранаюць тэмы сэнсу жыцця, празмернай бацькоўскай апекі, з-за якой у малых шмат абмежаванняў у жыцці. Па тэлефоне чуваць, што яны ў роспачы. А пасля гутаркі ў дзяцей з'яўляецца надзея, нават на размову з бацькамі з іншага боку. Была дзяўчынка, у якой змяніліся стасункі з мамай у адзін дзень. Раніцай яна пазваніла, пасля патлумачыла матулі, чаго насамрэч хоча, падзякавала за клопат, абедзве расплакаліся, і мама прыняла той факт, што дачка гатовая да большай самастойнасці. І ўвечары дзяўчынка пазваніла яшчэ раз, каб падзякаваць, што ўсё атрымалася.

Параіць нельга выслухаць

Дзеці, якія тэлефануюць на тэлефон даверу, — найчасцей за ўсё няўпэўненыя ў сабе, яны маюць мала сяброў і ім няма з кім падзяліцца сваімі перажываннямі, таму яны і звяртаюцца па падтрымку, расказала кансультант.

Ва ўсіх спецыялістаў на лініі ёсць псеўданімы — дзеля бяспекі. Гэта зручна таксама і для падлеткаў, якія звяртаюцца не ўпершыню. Яны могуць высветліць па псеўданіме, калі дзяжурства гэтага аператара, і працягнуць з ім размову.

— Хоць наша служба разлічана на экстранную дапамогу, ёсць дзеці, якім трэба пагаварыць больш. Асабліва калі справа датычыцца рэгіёнаў, дзе псіхалагічная дапамога больш абмежавана, а тэлефон даверу — бадай што адзіная магчымасць пагаварыць з кімсьці хутка і не сустракаючыся. Бывае, што дзеці вучацца далёка ад дома. А ёсць і такія, што ўжо мелі стасункі з псіхолагам і нешта ў іх не атрымалася, таму малому патрэбна падтрымка, пакуль не знойдзецца іншы спецыяліст, — абазначыла Марыя.

Кансультанты тэлефону даверу стараюцца не даваць парад, а імкнуцца выслухаць, падтрымаць, паспрабаваць павярнуць праблемную сітуацыю так, каб малы сам убачыў, што яшчэ не рабіў. То-бок падштурхнуць яго да самастойных высноў. Можна прапаноўваць варыянты, раіць паглядзець на праблему так ці вось так, аднак не даваць толькі адну параду. Аператары дапамагаюць сфарміраваць перспектыву развіцця сітуацыі, прыдумаць план далейшых дзеянняў.

Марыя часам кажа сваім абанентам: «Калі ты хочаш, мы можам нейкі час працягваць размову, аднак лепш, калі гэта будзе спецыяліст, да якога ты зможаш прыходзіць не па тэлефоне, а вочна»:

— Ёсць праблемы, якія хранічна не вырашаюцца, і ёсць віды дапамогі больш эфектыўныя, чым проста паразмаўляць. У залежнасці ад запытаў дзяцей мы заўжды раім, куды яны могуць звярнуцца для вырашэння сваёй праблемы, расказваем, дзе якія цэнтры існуюць і якія віды дапамогі прапануюць. Ёсць сапраўды адзінокія малыя, якім няма больш з кім пагаварыць, таму мы стараемся хоць бы па тэлефоне нейкі час «весці» дзяцей, пакуль ім гэта будзе патрэбна, прапаноўваем ім перазвоньваць, расказваць пра жыццё. Аднак праз тэлефон мы ўсё роўна абмежаваны ў сродках дапамогі.

«Трэба» і «хачу»

Наплыў званкоў сезонны. Летам менш напружання ў стасунках, а з пачаткам навучальнага года пачынаюцца скаргі, што хтосьці абражае, навязвае сяброўства, насміхаецца, адбірае рэчы.

— Падставай для кпінаў можа стаць што заўгодна, — канстатуе аператар. — Некага праследуюць за знешнасць (абзываюць акулярыкам), а нехта мае недахопы фізічныя, напрыклад кульгае — заўжды ёсць да чаго прычапіцца. Булінг у школе, як правіла, праяўляецца ў абразах, падколках, імкненні вывесці ахвяру на нейкую рэакцыю, каб пасля пакпіць. А праблемы з бацькамі вынікаюць з непаразуменняў. Падрастаючы, падлеткі ўжо хочуць самастойнасці і незалежнасці, хочуць займець іншы статус, а бацькі працягваюць бачыць у іх маленькіх, хочуць працягваць маніпуляваць імі і кіраваць.

— Восень і вясна — час абвастрэнняў. Для нервовай сістэмы гэта і так нестабільны перыяд. А пачатак вучэбнага года — яшчэ і выклік для інтэлекту, калі менш глядзяць на рэакцыю асобы дзіцяці, а больш — на навучанне, і для малых гэта пераўтвараецца ў бесперапынны іспыт, — мяркуе аператар. — Неабходна, каб слова «трэба» ў школе ўраўнаважвалася словам «хачу» па-за яе межамі, каб малыя ведалі і казалі, што хочуць займацца ў нейкіх гуртках, хочуць сябраваць. А бывае, што дзіця і не хоча нічым займацца, бо мела вопыт, калі гэта не ацанілі, не ўхвалялі яго дасягненні, то-бок вынік яго стараньняў абясцэньваўся, таму і прыкладаць сілы пачынаць нешта яно не бачыць сэнсу. Гэта прыводзіць да таго, што ў малых не хапае амбіцый, і яны пражываюць несамастойна ўсё жыццё.

Летам тэматыка званкоў датычыцца ў асноўным перажыванняў адносна паступлення ў ВНУ. Што рабіць, калі не паступіў? А што — калі паступіў, але не туды, куды хацеў? Як прэзентаваць сябе ў новым калектыве? Тэлефануюць і непакояцца і бацькі: як засцерагчы дзяцей з перыферыі ад спакус вялікага горада.

Эфект спадарожніка

Апошнім часам назіраецца добрая тэндэнцыя: звоняць не толькі бацькі, але і настаўнікі, сацыяльныя педагогі, якія зацікаўлены ў добрым настроі і стане сваіх выхаванцаў. Яны акрэсліваюць праблему, цікавяцца, як быць, слухаюць рэкамендацыі, звоняць ізноў, каб расказаць, што паспрабавалі.

— Адбылося гэта таму, што з часам падлеткі сталі больш «нязручнымі», тым самым вымусіўшы звярнуць на сябе ўвагу. Раней альтэрнатыў тэлефону даверу было няшмат, а цяпер ёсць многа месцаў, куды можна звярнуцца, у тым ліку і анлайн, — лічыць Вольга Навуменкава.

Выходзячы з таго, як дарослы чалавек фармулюе праблему, залежыць і дапамога аператара. Калі бацькі не разумеюць задач узросту, у якім знаходзіцца іх дзіця, ім даюць агульную інфармацыю пра развіццё малых у гэтым узросце, каб мама ці тата самі зразумелі, што іх метады выхавання непрымальныя для перыяду, якога дасягнула іх дзіця. Уздымаюць і праблемы прафесійнай арыентацыі. Тады даюць звесткі пра цэнтры прафарыентацыі, дзе дзеці могуць прайсці тэсціраванне і кансультацыі, патлумачыла аператар:

— Калі нейкія метады выхавання не працуюць, я дапамагаю бацькам зразумець, што ім яшчэ можа зрабіць, каб палепшыць сітуацыю. Не існуе агульных рэкамендацый, якія можна было б раздаць усім бацькам як памятку — гэта заўжды індывідуальна. Аднак усе пытанні стасункаў з падлеткамі лепш усё ж вырашаць са спецыялістамі ўжывую, калі можна правесці дыягностыку малых. Мы ж гэтага па тэлефоне зрабіць не можам, а толькі першасна пракансультаваць і пераарыентаваць на спецыялістаў для вочнай работы.

Тым не менш па-ранейшаму застаецца актуальным пытанне стыгматызацыі — паход да псіхолага дагэтуль лічыцца траўматычным. Падлеткі могуць вочна і самастойна, без згоды бацькоў, звярнацца да спецыяліста з 14 гадоў, і гэта дае траўматызму, бо не кожны дарослы згодны на такія наведванні і непакоіцца: няўжо ён сам не здольны дапамагчы дзіцяці, падкрэсліла Вольга Навуменкава:

— Мы кажам у такім выпадку бацькам, што іх занепакоенасць — гэта добра, аднак у малых спрацоўвае эфект спадарожніка: чужому чалавеку можна расказаць усё, і гэта будзе бяспечна. Некаторыя пытанні з прычыны асаблівасцяў узросту ці псіхікі падлетак можа расказаць выключна чужому, і такі пасрэднік вельмі важны для непаўналетняга.

Ірына СІДАРОК.

Думкі ўслых

Доўгачаканы дзень

Прайшло шмат часу, пакуль здзейснілася гэта важная падзея. Да свята Дзень маці афіцыйна дадалося свята Дзень бацькі, якое мы будзем адзначаць 21 кастрычніка.

Дзіцяці аднолькава патрэбныя і важныя як мама, так і тата. Вядома, дзяўчынкі больш цягнуцца да маці, спасцігаючы поруч з ёю ўсе жыццёвыя прамудрасці, а хлопчыкі — да бацькі. Яны шмат чаму вучацца ў яго, пераймаючы станоўчыя прыклады, стараюцца быць падобнымі на тату. А той, адчуваючы адказнасць, імкнецца апраўдаць давер.

Сям'я, дзе ёсць абое бацькоў, — шчаслівая. У такой сям'і маці не турбуецца за будучыню сваіх дзяцей. Яна ведае, што не адна, а з ёю побач надзейны абаронца і апора — не толькі для яе, але і для дзяцей. Калі маці адсутнічае ў сям'і па якой-небудзь уважлівай прычыне, то бацька цалкам бярэ на сябе яе абавязкі: гатаванне ежы, мыццё, прыборку, перажыванне за дзяцей, бяссонныя ночы і трывожныя дні ў час хвароб. І ўсё гэта таты рабілі і робяць, не чакаючы якойсьці пахвалы. Проста разумеюць, што так трэба.

Шмат чаго залежыць ад бацькі. Гэта не толькі маральная, душэўная падтрымка, але і матэрыяльная. Муж і бацька — гэта здабытчык. Чым больш ён зарабляе і прыносіць у сям'ю, тым надзейней яе дабрабыт. Бо дзеці патрабуюць вялікіх затрат: на харчаванне, адзенне, абутак, лекі, заняткі ў гуртках, правядзенне вольнага часу. І сапраўдны муж і бацька бярэ на сябе ўсе гэтыя задачы і стараецца іх вырашаць.

Калі ж мужчына сыходзіць з сям'і, то гэта, на маю думку, у асноўным слабы, бязвольны чалавек, які не справіўся са сваімі задачамі і абавязкамі, спужаўся цяжкасцяў, захацеў лёгкага «прыгожага» жыцця, аказаўся

дрэнным бацькам і мужам. Такі чалавек, па-мойму, не заслугоўвае ні любові, ні павагі...

Іншая справа — бацькі сапраўдныя. Вось для іх — Бацькоў з вялікай літары — і аб'яўлена 21 кастрычніка святам Дзень бацькі. І гэта цалкам заслужана. Бо, калі адзначаецца свята Дзень маці, то праводзяцца ўрачыстыя мерапрыемствы, сустрэчы, дзе маці віншуюць, гавораць ім словы падзякі, уручаюць узнагароды. Дораць кветкі, адзначаюць іх заслугі. А таты толькі сціпла назіраюць за ўсім гэтым, быццам яны тут ні пры чым. Ну, а цяпер усё стала на свае месцы. Уявіце сабе такога тату, якога таксама будуць прылюдна хваліць за яго неацэнны ўклад у выхаванне дзяцей. Гэта яго акрыліць, надасць новых сіл, энергіі, стымулу. Станоўчы зарад, штуршок на далейшыя добрыя справы. І ён яшчэ больш будзе старацца апраўдаць ускладзеныя на яго надзеі і давер сваіх дзяцей, жонкі і дзяржавы.

Хачу пажадаць усім татам горда несці званне бацькі і сваімі ўчынкамі і справамі даказваць, што справядліва заслужылі сваё свята.

Таццяна ЧЭКЕД,

г. Гомель.

«ЗОРКІ» ЗА ПАРТАЙ

Надышоў новы навучальны год, і мы папрасілі вядомых людзей згадаць, як яны пайшлі ў першы клас і чым ім запомніліся школьныя гады.

Часы былі цяжкія, а навучанне — на найвышэйшым узроўні

— У першы клас я пайшоў у 1952 годзе — у 43-ю школу горада Арэнбурга, — распавядае **Уладзіслаў МІСЕВІЧ, заслужаны артыст БССР, адзін з заснавальнікаў ВІА «Песняры».** — У той час у Арэнбургу былі школы, якія адносіліся да Міністэрства адукацыі, а былі і такія, што падпарадкоўваліся чыгункам. А яшчэ паасобныя, у якіх вучыліся толькі дзяўчаты ці толькі хлопцы, і змешаныя. Я пайшоў вучыцца ў змешаную школу Мінадукацыі, а мой брат вучыўся ў мужчынскай чыгуначнай.

Уладзіслаў МІСЕВІЧ, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Першыя два класы хадзілі ў школу ў тым адзенні, якое было. Лінейка ў пачатку навучальнага года ў нас праводзілася, але не памятаю, каб хто прынёс кветкі. Вучыцца мне было цікава, але музыка захапляла значна больш. Памятаю добрую спартзалу, а вось сталовай не было. Мы насілі ссабойкі — тое, што нам маглі даць бацькі. І з гэтым была звязана такая гісторыя. Аднакласніца прынесла бутэрброд, загорнуты ў газету з партрэтам Сталіна. Уся школа стаяла на дыбах! Выклікалі бацькоў дзяўчынкі, правялі выхаваўчую размову. Па тых часах лёгка абышлося. Добра запомніў дзень смерці Сталіна — 5 сакавіка 1953 года. Раніцай з рэпрадуктараў гучала прамова дзядзькі з каўказскім акцэнтам, але не Сталіна. Гэта быў Берыя. У горадзе бесперапынна гулі паравозы. Уся школа залівалася слязамі. У нашай сям'і жалобы не заўважыў, але бацька быў насцярожаны: невядома, што за кадры прыйдуць.

«Аднакласніца прынесла бутэрброд, загорнуты ў газету з партрэтам Сталіна. Уся школа стаяла на дыбах!»

У трэці клас мяне перавялі ў іншую школу, якая толькі што атрымала статус змешанай. Для мяне нічога новага, а вось для дзяўчынак, якія раней там вучыліся, думаю, і стрэс, і цікаўнасць, бо прыйшлі вучыцца хлопцы. З 1954 года ў СССР ужо не было паасобных школ. Тады ж у мяне з'явілася школьная форма — вельмі падобная на тую, у якой хадзілі гімназісты да рэвалюцыі.

У нашага пакалення была вялікая прага ведаў, нам пашанцавала, што настаўнікі таго часу — людзі, для якіх гэтая прафесія як пакліканне. Дарэчы, яны самі вучыліся яшчэ ў дарэвалюцыйных гімназіях і ўсё найлепшае адтуль перадавалі нам. Часы былі цяжкія, але навучанне, на мой погляд, ажыццяўлялася на найвышэйшым узроўні. Мяркую, што дзякуючы сваім настаўнікам мне і сёння цікава ўсё новае. Маё школьнае жыццё скончылася пасля 7 класа, калі я паступіў у Арэнбургскае суворaўскае вучылішча не столькі дзеля кар'еры ваеннага, колькі дзеля аркестра пры вучылішчы. Менш чым праз два гады вучылішча расфарміравалі, і я апынуўся ў Арэнбургскім авіяцыйным, у якім таксама быў аркестр. Вучылішча вядомае тым, што яго выхаванец — Юрый Гагарын. І кожны раз, калі ён бываў у Арэнбургу, вакол якога шмат вучэбных аэрадромаў, прыязджаў у альма-матар і меў цёплыя зносіны з педагогамі. Мы, вядома, ганарыліся такім выпускніком.

Рэпетыцыя з партфелем, ці «Ты, што, на другі год засталася?»

— У школу я пайшла ў 1953 годзе. Наша сям'я жыла ў сталіцы, у трохпавярховым доме амаль насупраць старога аэрапорта. Вельмі добра памятаю, як 1 верасня мама вяла мяне ад дома да вуліцы Чкалава — там была і ёсць школа № 1, — успамінае **Людміла ПАЛКОЎНІКАВА, легенда беларускай музычнай журналістыкі.** — Па цяперашніх мерках мы прайшлі пешшу два прыпынкі, дарога мне здавалася вельмі доўгай. Але я радавалася новай сукенцы — карычневай школьнай форме і беламу фартуху. А яшчэ ж быў партфель і, вядома, букет!

Людміла ПАЛКОЎНІКАВА, фота з асабістага архіва.

Гэта цяпер школа мае некалькі карпусоў, тады быў адзін — самавіты будынак, ацалелы ў гады вайны. Чамусьці запомнілася, як дарослыя радасна абмяркоўвалі, што з гэтага года прыбіральні ў самой школе, а не на вуліцы. Мне гэта было дзіўна, таму што я жыла ў доме з усімі выгодамі і не ўяўляла, што такое «на вуліцы». Гэта ўжо пазней, познаёміўшыся з аднакласнікамі, я ўбачыла і драўляныя баракі, і прыватны сектар з выгодамі ў дварах.

Добра памятаю тую атмасферу свята! Ганак школы быў, як зараз сказалі б, «сцэнічнай пляцоўкай», тут стаяла некалькі чалавек, астатнія людзі запоўнілі ўсю прастору да дарогі. Шчаслівыя твары прысутных і тое, як усе дружна апладзіравалі выступоўцам, часам і цяпер успліваюць у памяці!

Яшчэ запомніла вясёлую мітусню, калі нас размяркоўвалі

«Запомнілася, як дарослыя радасна абмяркоўвалі, што з гэтага года прыбіральні ў самой школе, а не на вуліцы. Мне гэта было дзіўна».

па парах — дзяўчынак з хлопчыкамі. Мяне паставілі з Эдзікам Райхціным, ён быў мне знаёмы як хлопчык з суседняга дома. Эдзік спытаў: «Ты, што, на другі год засталася?!» Я вельмі здзівілася і адказала: «Не!», але ён толькі засмяяўся. Я вельмі разгубілася і засмуцілася. Мама заўважыла: са мной нешта не так, спытала, што здарылася, і я ёй расказала. Яна звярнулася да Эдзіка, і ён растлумачыў, што бачыў мяне ўчора ў двары, і я была з партфелем. Ён вырашыў, што я ішла са школы. А гэта я ганарліва крочыла перад домам з новенькім партфельчыкам і рэпеціравала заўтрашні паход у школу. Смешна, але да гэтага часу памятаю той эпізод!

У сваю першую настаўніцу Аляксандру Трафімаўну закахалася на другі школьны дзень, і гэтае пачуццё захавалася дагэтуль.

1 верасня — гэта і сямейнае свята

— Мне пашанцавала на ўсіх этапах навучання дзякуючы выдатным педагогам, якія сустрэліся на жыццёвым шляху, — кажа **Віктар БАБАРЫКІН, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, дырыжор Белдзяржфілармоніі, аўтар праграмы «Вечар у мажоры» на «Радыё Мінск».** — Мне здаецца, 1 верасня — гэта і сямейнае свята. Мая мама, Наталля Віктараўна, якой я вельмі ўдзячны, стварала менавіта такі настрой. Добра памятаю адпрасаваны школьны гарнітур і белую кашулю ад мамы і букет кветак для настаўніцы. Такім я запомніў гэты дзень і такім жа стараюся зрабіць яго сёння для свайго сына Аляксея.

Віктар БАБАРЫКІН, фота Алы ТКАЧЭНКІ.

У агульнаадукацыйнай сталічнай школе № 8 я хутка стаў «зоркай», таму што добра спяваў і выступаў у кожным канцэрце. Акрамя звычайнай школы, хадзіў у музычную. Я хітрыў, і калі мне хацелася збегчы са школы ў секцыю картынгу і матацыклаў, казаў: «Сёння ў мяне канцэрт у музычнай школе».

«Ён ніколі не прымушаў вучняў займацца, але была нейкая магія, ён умеў зацікавіць. Сярод навучэнцаў была здаровая канкурэнцыя».

З'явілася і «зорная хвароба». Разам са сваім педагогам ДМШ № 14, Міхаілам Віктаравічам Кабзаравым, паехаў на Усесаюзны конкурс трубачоў імя Вячаслава Шчолакава ў горад Магнітагорск. Там заняў трэцяе месца, стаў лаўрэатам пры тым, што першае і другое не прысуджылі нікому. Вырашыў, што ў музыцы ўсяго дасягнуў, і месяц не хадзіў на заняткі, праводзіў увесь гэты час у секцыі картынгу. А калі бацькам патэлефанавалі з музшколы...

Шчыра кажучы, прышчэпку ад «зорнай хваробы» атрымаў добрую. Праз шмат гадоў, калі гастрольны тур вядомага італьянскага тэнара Алесандра Сафіна праходзіў у тым ліку па Чалябінскай вобласці, а я быў запрошаным дырыжорам, вельмі цёпла ўспамінаў той конкурс.

Са школы пайшоў пасля 8 класаў і паступіў у музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі. Я трапіў у клас Уладзіслава Сцяпанавіча Арлеанскага, і гэта вялікае шанцаванне. Ён ніколі не прымушаў вучняў займацца, але была нейкая магія, ён умеў зацікавіць. Сярод навучэнцаў была здаровая канкурэнцыя. Сёння яго вучні з вялікім поспехам выступаюць у аркестрах па ўсім свеце.

Мы прыходзілі ў вучылішча за гадзіну-дзве да пачатку ўрокаў, выстройваліся на лесвіцы ў пралётах паміж паверхамі і ігралі, калі не паспявалі заняць класы для індывідуальных заняткаў — іх на ўсіх не хапала. І ўсё роўна гэта быў цудоўны час. У вучылішчы я ўпершыню стаў за дырыжорскі пульт.

Віктар БАБАРЫКІН, фота з асабістага архіва.

У Беларускай акадэміі музыкі мне таксама пашанцавала з педагогамі. Спачатку я вучыўся ў вайсковага дырыжора, заслужанага артыста БССР палкоўніка Барыса Сцяпанавіча Чудакова. Яму, дарэчы, нядаўна споўнілася 90 гадоў, а ён дагэтуль выкладае ў ВДАМ! Затым вучыўся ў народнага артыста Расіі, вядомага дырыжора маэстра Генадзя Панцеляймонавіча Праваторава на оперна-сімфанічным факультэце. Шчыры дзякуй маім цудоўным педагогам!

Ірына ВІДАВА, фота з асабістага архіва.

У шэсць раніцы на трэніроўку — станавіся!

— Каб паступіць у падрыхтоўчы клас спартыўнай школы, мне прыйшлося здаць іспыт, — кажа **спявачка Ірына ВІДАВА-МОЛЧАН.** —

Ірына ВІДАВА, фота з асабістага архіва.

З пяці гадоў я займалася фігурным катаннем, і мне прапанавалі вучыцца ў спартыўным класе. Экзамен заключаўся ў тым, што трэба было прабегчы дзевяць кругоў па школьным стадыёне. Мая мама — медык, і яна вельмі абурылася, што дзецям даюць такую вялікую нагрузку. Трэнер растлумачыў, што трэба проста прабегчы, усё роўна, як хутка мы гэта зробім. Толькі пазней я зразумела, што сутнасць выпрабавання ў тым, ці гатовы ты выконваць заданне, даводзіць пачатую справу да завяршэння. Я прабегла!

Мая старэйшая сястра любіла заплятаць мне косы, прыдумляць прычоскі, так што, акрамя бантаў, быў яшчэ нейкі крэатыў. У 33-ю школу мяне завялі бацькі. Лінейка, кветкі — усё, як ва ўсіх.

А вось вучыліся мы зусім інакш. На першыя заняткі на катку «Юнацтва» мы прыязджалі ў шэсць гадзін раніцы. Для нас было нормай пяць-шэсць розных трэніровак за дзень. Хачу адзначыць, што ў наш час форма, экіпіроўка і харчаванне былі бясплатнымі для дзяцей са спартыўных класаў. Абедалі мы нават не ў школе, а ў кафэ «Вясёлка» ў парку Горкага.

Вельмі ўдзячная гэтай школе, яна сфарміравала характар, загартавала, навучыла самастойнасці — мы ж ездзілі на зборы, выступленні.

Калі я вучылася ў чацвёртым класе, тата — ваенны лётчык — атрымаў прызначэнне ў Германію. Там я вучылася ў школе нашага ваеннага гарадка. Спачатку здзівіла новых аднакласнікаў сваёй фізічнай падрыхтоўкай, а потым тым, што магла і пабіцца, калі крыўдзілі слабага.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

З нагоды

ПАСПЯХОВАСЦЬ... «У ТАЛЕРЦЫ»

Вучоны-нутрыцыёлаг распавяла пра памылкі дарослых у вызначэнні дзіцячага рацыёну

Навукова даказана: пачуццё голаду зніжае ўвагу на ўроках, а недахоп у рацыёне неабходных для росту і развіцця арганізма рэчываў пагаршае памяць і ўседлівасць дзіцяці. Нутрыцыёлагі кажуць, што бацькі дапускаюць мноства звычайных, нават, можна сказаць, традыцыйных памылак у харчаванні дзяцей. Між тым часам дастаткова скарэктаваць дзіцячы рацыён, каб заўважыць паляпшэнні... у школьным дзённіку.

Пра тое, што мамы робяць няправільна, мы спыталі ў намесніка генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», дацэнта Алены МАРГУНОВАЙ.

— Мара і мэта любых бацькоў — здаровыя, прыгожыя, па ўзросце развітыя дзеці. Пры гэтым усе мамы ведаюць, што дасягненне гэтай мэты шмат у чым звязана з харчаваннем, а таму імкнуцца забяспечыць дзіцяці паўнавартасны рацыён. Давайце пагаворым аб тыповых памылках дарослых у падборы рацыянальнага, збалансаванага харчавання для свайго дзіцяці.

— Правільнае харчаванне дзіцяці — залог яго здароўя ў будучыні, пра гэта пастаянна паўтараюць медыкі і дыетолагі. Але часам нават самая руплівая і дасведчаная мама не можа забяспечыць сыну або дачцэ паўнавартасны рацыён. Справа ў тым, што па меры сталення дзіцяці ў яго талерцы з'яўляецца не зусім карысная ежа, якая да таго ж змяшчае мноства прыпраў, разнастайных дабавак, фарбавальнікаў і кансервантаў. Найбольш тыповыя пытанні бацькоў — «Чаму дзіця дрэнна вучыцца?», «Чаму школьнік няўважлівы на ўроках?», «Чаму часта хварэе?», «Чаму гіперактыўны?» На ўсе гэтыя пытанні можна даць просты адказ: паглядзіце, як ваша дзіця сілкуецца. Рацыён — тое, што наш арганізм можа ўзяць з ежы на пабудову сябе. А неабходныя арганізму — у першую чаргу амінакіслоты (аснова з бялку), тлушчы (будаўнічы матэрыял для клетак), вугляводы (чыстая энергія), вітаміны, мікра- і макраэлементы (каталізатары ўсіх абменных працэсаў у арганізме), вада. Дапусціце адсутнасць або недахоп аднаго або некалькіх гэтых элементаў у харчаванні — і рэакцыі пачынаюць працякаць у арганізме павольна, абмен рэчываў запаволіваецца...

«Калі ваша дзіця харчуецца пераважна цукеркамі, сокамі, пячэнькамі і нічога іншага ў яго не «засунеш», то бялок браць няма адкуль, антыцелы не выпрацоўваюцца».

— Пачынаючы гадоў з трохчатырох значны час дзіця праводзіць у арганізаваных калектывах (сад, школа), і яго харчаваннем займаюцца іншыя людзі, а не бацькі. Напэўна, у дзіцячых установах якраз меню больш збалансаванае, чым дома?

— Над рацыёнам харчавання ў дзіцячых установах на сёння праведзена вялікая праца. Збалансаваны рацыён у школьных сталовых і дзіцячых садках, перагледжаны асартыментны пералік у школьных буфетах, ліквідаваны перакос у бок вугляводаў, які захоўваўся да нядаўняга часу. Так што сёння можна сцвярджаць: харчаванне ў дзіцячых установах сапраўды рацыянальнае для дзіцяці, пабудавана з улікам фізіялагічных нормаў і патрэб арганізма, што расце. І цяпер справа за бацькамі. Бо калі дзіця вяртаецца дадому, рацыянальнасць яго харчавання часта знікае. У асартыментным пераліку школьных буфетаў сёння няма чыпсаў, жавальнай гумкі, шакаладных цукерак і салодкай газіроўкі, але ўсё гэта даступна ў крамах на шляху са школы або садка дадому. І, як вынік, з вугляводамі ў дзіцячым рацыёне нярэдка захоўваецца перабор, нягледзячы на ўсе намаганні медыкаў, дыетолагаў, спецыялістаў Камбіната школьнага харчавання.

Піце, дзеці, малако...

— А які элемент можна лічыць найважнейшым для дзіцяці?

— Бялок. Менавіта бялок — асноўны будаўнічы матэрыял для развіцця. Гэта тое, з чаго складаюцца косці, мышцы, сасуды, органы, тканіны, скура. Бялок вельмі важны для арганізма, які расце. Штодня яму патрэбныя ферменты, гармоны, біялагічна актыўныя аміны — калі арганізм недаатрымае іх з ежай, то возьме

з мышцаў. Не з'елі норму бялку — пакутуе ў першую чаргу сардэчная мышца, а потым пачынаюць пакутаваць іншыя органы. Усе сасуды будуюцца з бялку, недахоп бялку — і сасуды становяцца млявымі, адрузлымі, зніжаецца ціск, клетка не зможа ўтрымліваць ваду, з'яўляюцца ацёкі. Яны будуць да таго часу, пакуль захоўваецца дэфіцыт вады і бялку. Не хапае бялку — арганізму няма чым ператраўліваць ежу, бо ўсе стрававальныя ферменты — гэта бялкі. Акрамя таго, бялок — гэта транспарт: ёсць у арганізме патрэбны бялок — патрэбная вітамінка трапіць у патрэбную клетку. Замкнёнае кола! Недахоп бялку ў рацыёне дзяцей будзе адбівацца на постаці (сутуласць, скаліёз), імунітэце (усе гармоны, ферменты, антыцелы — бялкі), росце, развіцці, у тым ліку палавым. Невыпадкова сучасным дзецям вельмі цяжкія фізічныя нагрузкі, яны амаль пагалоўна недалюбліваюць урокі фізкультуры. Калі ваша дзіця харчуецца пераважна цукеркамі, сокамі, пячэнькамі і нічога іншага ў яго не «засунеш», то бялок браць няма адкуль, антыцелы не выпрацоўваюцца. Дзіця часта і доўга хварэе. У дзіцячым рацыёне асабліва важны бялок, у якім прысутнічаюць незаменныя амінакіслоты — гэта тыя, якія не выпрацоўваюцца ў арганізме, таму павінны быць атрыманы з ежай (бялок курынага яйка, каровіна малако, сыры (адыгейскі, сулугуні, наш беларускі клінковы), рыба, мяса).

— Колькі бялку неабходна дзіцяці?

— Патрэба ў дзяцей ад года да сямі гадоў — тры-чатыры грамы бялку на кілаграм масы цела. Школьнікам неабходна ад двух да трох грам бялку на кілаграм. Патрэба дарослага чалавека ў бялку складае 1-1,5 грама на 1 кг масы

цела. У раннім узросце асабліва каштоўныя бялкі малочных прадуктаў. Яны ўтрымліваюць увесь комплекс незаменных амінакіслот, лёгка ператраўліваюцца і добра засвойваюцца арганізмам дзіцяці. З дапамогай паўнавартаснага бялковага харчавання ваша дзіця атрымае адэкватную колькасць тлушчаў, з якіх з поспехам пабудуе клеткавыя мембраны, сінтэзуе гармоны, абароніць сябе ад рахіту.

Вытокі гіперактыўнасці

— Пагаворым пра вугляводы. Яны таксама неабходныя ў харчаванні школьніка?

— Разгледзім класічную ў сучасным свеце сітуацыю: дзіця непаслухмянае, дрэнна запамінае, недастаткова канцэнтруе ўвагу. А цяпер разбяром яго рацыён харчавання. Сняданак, абед і падвячорак у дзіцячай установе да нядаўняга часу — гэта перавага вугляводаў (пра гэта мы ўжо казалі). Па дарозе з дзіцячага садка чуллівая бабуля купляе «карысны сок» — як правіла, тэтрапак аб'ёмам 200 мл, у якім змяшчаецца ў сярэднім 25 грамаў вугляводаў. Каб было больш зразумела, гэта прыкладна дзве сталовыя лыжкі цукру! Школьнік, вяртаючыся са школы, купіць сабе «хуткія вугляводы» сам. Заўважце, ніякая мама ці бабуля не прапануюць дзіцяці такі канцэнтраваны цукровы сіроп. А ў гатовым прадукце — колькі заўгодна!

— Чым гэта небяспечна?

— Глюкоза і фруктоза — самыя моцныя стымулятары. Гэтыя простыя цукры выкарыстоўваюцца клеткай у якасці крыніцы энергіі. І гэтая залішняя энергія, што называецца, выходзіць вонкі. Менавіта яна — прычына гіперактыўнасці дзіцяці. Цэнтральнай нервовай сістэме і падстраўніквай залозе няпроста справіцца з такой вялікай колькасцю вугляводаў. Акрамя гэтага, многія дзеці не ядуць ежу, калі яна не салодкая, не п'юць чыстую ваду, а толькі салодкую, што парушае вугляводны абмен і рыхтуе глебу для цукровага дыябету. Нявыкарыстаныя цукры ператвараюцца ў тлушч, ствараючы перадумовы для атлусцення. Лішак глюкозы ў крыві «зацукрывае» бялкі, выводзячы іх са строю, зніжае імунітэт, перашкаджае рабоце ферментаў, гармонаў, шкодзіць крывяносным капілярам. У «глюкозном сіропе», у які ператвараецца кроў, актыўна развіваюцца мікраарганізмы — ім камфортна ў такім асяроддзі.

— Ці значыць гэта, што дыетолагі раяць выключыць вугляводы з рацыёну школьніка?

— Ні ў якім разе! Я не супраць вугляводаў — дзіця расце, затрачвае шмат энергіі, і вугляводы яму неабходныя. Але ва ўсім патрэбна салатая сярэдзіна.

«Цаглінкі» здароўя

— Яшчэ адно адвечнае пытанне — што даць дзіцяці ў школу на перакус, каб было сытна, карысна і збалансавана?

— У якасці перакусу звычайна бацькі даюць дзецям у школу бутэрброды і садавіну. Як правіла, дзеці з'ядаюць іх усухамятку, так што аплацыць гарачае харчаванне ў школьнай сталовай — больш пераважна. Часта пра ссабойку школьнікі ўспамінаюць толькі бліжэй да канца дня, таму прадукты і стравы, што хутка псуюцца (накшталт сэндвічаў з маслам і чырвонай рыбай або глазураваных сыркоў), лепш выключыць. Не варта спадзявацца, што, даўшы дзіцяці грошы, вы вырашыце праблему — хутчэй за ўсё, сума будзе выдаткаваная ў буфеце на які-небудзь прысмак (мармелад, зефір), з якога дзіця не атрымае поўнага комплексу неабходных рэчываў для паўнавартаснага перакусу. А ў цэлым правіла школьнай ссабойкі — асноўная (лепш бялковая) страва, садавіна/гародніна, дэсерт. Асноўнай стравай могуць выступаць рол з лаваша з курыным філе; тонка нарэзаная запечаная індычка; мясныя фрыкадэлькі; сэндвічы з сырам і вараным яйкам і г. д. Другі раздзел — гэта, напрыклад, некалькі памідорак чэры, маркоўныя або агурочныя палачкі, яблык ці груша, нарэзаныя долькамі. У якасці дэсерту падыдуць арэхі і сухафрукты. І не забываемся на чыстую пітную ваду, калі ў школе няма кулера.

«Так што сёння можна сцвярджаць: харчаванне ў дзіцячых установах сапраўды рацыянальнае для дзіцяці, пабудавана з улікам фізіялагічных нормаў і патрэб арганізма, што расце».

— Давайце падагульнім: дык як жа правільна складаць рацыён дзіцяці? З якіх «цаглінак» можна пабудаваць здароўе школьніка?

— Хачу яшчэ раз паўтарыць: для паўнавартаснага развіцця дзіцяці вельмі важна забяспечыць сутачную дозу бялку. Гэта першачарговая задача. Скажу больш: недахоп бялку ў рацыёне — гэта злачынства! Цяпер пра вугляводы. У 100 мл малака змяшчаецца 1 чайная лыжка малочнага цукру. Каб галаўны мозг не меў патрэбу ў глюкозе, досыць у суткі 30—45 грамаў вугляводаў, а гэта ўсяго толькі 2-3 сталовыя лыжкі цукру. Пры гэтым цукар бывае просты і складаны. Просты цукар (глюкоза, фруктоза, галактоза) адразу трапляе ў кроў. Складаны цукар (доўгія малекулы расшчапляюцца ферментамі да больш простых) таксама трапляе ў кроў. Больш павольна, праз некаторы час, але шлях адзін — менавіта ў кроў. Таму выключыць салодкія прысмакі вельмі проста, а вось зразумець, якія менавіта прадукты карысныя і ў карыснасці якіх мы памыляемся, — пытанне даволі складанае. Вось, напрыклад, у «карыснай» аўсянай кашы са шматкоў у адной порцыі масаў 60 грамаў змяшчаецца 30 грамаў вугляводаў (дзве сталовыя лыжкі цукру!). Выснова: з колькасцю вугляводаў неабходна вытрымліваць асцярожнасць, не забывацца на бялкі, вітаміны, мікра- і макраэлементы і ваду. Зразумела, патрэбныя школьніку і тлушчы: рацыён будзе аптымальным, калі яны складаюць каля 30 % (бялкі — парадку 20 %, вугляводы — да 50 %, у асноўным складаныя). Але гэта агульныя парады. У ідэале неабходны індывідуальны, персаніфікаваны падыход да кожнага дзіцяці ў тым, што датычыцца падбору яго рацыёну харчавання. Выходзячы з асаблівасцяў развіцця і здароўя, дыетолагі павінны вызначаць, што вашаму малому або падлетку неабходна ўжываць у ежу, карэкціруючы, такім чынам, абмен яго рэчываў і актыўнасць. Такую паслугу аказвае навукова-даследчая лабараторыя функцыянальнага харчавання НПЦ па харчаванні НАН.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«Я ХАЦЕЛА ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Раскажыце пра вашу сям'ю.

— Яна вялікая і дружная! Тата працуе лесніком у Орлікаўскім лясніцтве ўжо больш за 15 гадоў. Мама загадвае Бучацінскім сельскім Домам культуры. У мяне дзве малодшыя сястрычкі. Ведаеце, лесніка ў любы момант могуць выклікаць на працу, у мамы таксама няпросты графік, але мы, дзеці, заўсёды адчувалі клопат і ўвагу бацькоў. Яны знаходзілі час, каб дапамагчы з урокамі, проста пагутарыць. У той жа час бацькі ненадакучліва прывучалі нас да хатніх спраў. Бывалі мы і на працы ў іх. Мне вельмі падабалася, калі тата браў мяне з сабой. Ён добра ведае і любіць лес, гэта перадалося і мне.

— Як складаліся адносіны з сёстрамі: вы сябравалі або канкурыравалі?

— З сёстрамі ў мяне розніца ва ўзросце ў пяць і дзесяць гадоў. Не скажу, што нас можна назваць сяброўкамі, усё ж у дзяцінстве пяць гадоў здаецца вялізнай розніцай, але сёстры мы добрыя. Дакладна не было канкурэнцыі ні ў дзяцінстве, ні цяпер. Цяпер, думаю, мы бліжэй, таму што чым больш дарослымі мы становімся, тым менш прыкметная розніца ва ўзросце.

Funat.pro

лівых адрозненняў ад горада. Галоўнае — не ў якім населеным пункце ты жывеш, а як. Можна пражыць усё жыццё ў сталіцы і ні разу не схадзіць у тэатр, а можна жыць у вёсцы і не прапусціць ніводнай прэм'еры.

— Памятаеце свой першы працоўны дзень?

— Вядома. Мне было і страшна, і цікава адначасова. З першых крокаў хацелася паглыбіцца ў работу лясніцтва. Памятаю, задавала шмат пытанняў ляснічаму, мне нават здавалася, што ён злуецца.

— У чым перавагі быць прадстаўніком дынастыі і ў чым складанасць?

— У нашай сям'і дынастыя лесаводаў толькі пачынае складвацца.

Калектыў Бабаўнянскага лясніцтва
Капыльскага доследнага лясгаса Мінскай вобласці.

— Калі вы цвёрда вырашылі, што прафесійную дзейнасць звяжаце з лясной гаспадаркай? Бацька вас падтрымаў?

— У выпускным класе вырашыла, што хачу працаваць у лясной гаспадарцы. Пачала больш адказна вучыць прадметы для здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Тата не вельмі быў рады майму выбару прафесіі, але і адгаворваць не стаў. Мама таксама прыняла мой выбар. Вельмі ўдзячна бацькам, што яны далі мне магчымасць самой вырашаць, кім быць. Цяпер разумею, што не памылілася ў выбары прафесіі і ўпэўнена, што знайшла сваё пакліканне.

— Вы вучыліся па мэтавым накіраванні, гэта значыць, ведалі, што вернецеся дадому. Чым дарагая вам Капыльшчына?

— Як бы пафасна ні гучала, але тым, што гэта мая радзіма. Я з упэўненасцю магу сказаць, што на Капыльшчыне асабліва прыгожыя мясціны, багатая гісторыя. На шчасце, я не з тых дзяцей, якія мараць хутчэй пакінуць бацькоўскі дом. Я хацела вярнуцца працаваць дадому, каб быць бліжэй да бацькоў, бо яны ў мяне самыя лепшыя. У бацькоў цудоўны дом, наладжаны побыт, не бачу асаблівых адрозненняў ад горада. Галоўнае — не ў якім населеным пункце ты жывеш, а як. Можна пражыць усё жыццё ў сталіцы і ні разу не схадзіць у тэатр, а можна жыць у вёсцы і не прапусціць ніводнай прэм'еры.

— Памятаеце свой першы працоўны дзень?

— Вядома. Мне было і страшна, і цікава адначасова. З першых крокаў хацелася паглыбіцца ў работу лясніцтва. Памятаю, задавала шмат пытанняў ляснічаму, мне нават здавалася, што ён злуецца.

— У чым перавагі быць прадстаўніком дынастыі і ў чым складанасць?

— У нашай сям'і дынастыя лесаводаў толькі пачынае складвацца. Мая сястра скончыла 3 курс БДТУ і ўжо ў верасні прыйдзе ў Бабаўнянскае лясніцтва на практыку. Самая малодшая ў наступным годзе заканчвае 11 клас, пакуль яшчэ канчаткова не вызначылася з ВНУ, але БДТУ застаецца ў прыярытэце. Думаю, усё ж працягне наш шлях.

Перавага ў тым, што ты свядома выбіраеш прафесію, і ў тым, што табе можа падказаць, дапамагчы родны чалавек. Складанасць у тым, што адказваеш не толькі за сябе, а за гонар усёй сям'і. Але мяне гэта не бянтэжыць: трэба проста добра рабіць сваю справу.

— Ляснічы кіруе мужчынскім калектывам: леснікамі, лесарубамі, кіроўцамі. Як вы сябе рыхтавалі да гэтага складніка работы?

— Асабліва ніяк. Разумела, што калі мае распараджэнні будуць адэкватнымі, то іх будуць выконваць. Вельмі важна наладзіць зваротную сувязь, каб людзі адкрыта гаварылі аб праблемах, прапаноўвалі рацыянальныя рашэнні. Калектыў у нас вельмі згуртаваны, выпадковых людзей няма, усе працуюць з поўнай аддачай.

— Ці задаволеныя вы заробкам, сацыяльнай падтрымкай?

— Заработная плата ў мяне прыстойная. Ведаю, што і калегі не скардзяцца. Маладыя спецыялісты ахвотна ідуць да нас на працу. У 2020 годзе лясгас пабудаваў шматкватэрны жылы дом, у якім я зараз жыву ў арэнднай двухпакаёвай кватэры. У лясгасе добры сацыяльны пакет. Праводзяцца цікавыя мерапрыемствы, якія гуртуюць наш калектыў.

«Можна пражыць усё жыццё ў сталіцы і ні разу не схадзіць у тэатр, а можна жыць у вёсцы і не прапусціць ніводнай прэм'еры».

— У вашай рабоце абавязкова наяўнасць спецадзення. Але пры гэтым ёсць жаданне заставацца жаноцкай. Як часта можаце сабе дазволіць, напрыклад, абцасы?

— Жаноцкай можна быць і ў форме! Абцасы магу дазволіць сабе рэдка, толькі калі якое-небудзь мерапрыемства. У паўсядзённым жыцці — зручны абутак, каб прайсці па лесе і кіраваць службовым аўтамабілем.

Думаю, што жаноцкасць — не толькі знешнасць. Мне здаецца, жанчыны-кіраўнікі думаюць не толькі аб тым, каб падначаленыя шчыравалі на працы, але каб яны і дадому, у сям'ю прыходзілі з добрым настроем. Мне вельмі падабаецца гэтая формула, калі чалавек з радасцю ідзе дадому, каб заўтра з задавальненнем пайсці на працу.

— Па-за работай бываеце ў лесе?

— Так, вельмі люблю збіраць грыбы! Праўда, для гэтага лепш з'ехаць у іншы раён.

— Якімі працоўнымі дасягненнямі ганарыцеся? А асабістымі?

— Складана яшчэ казаць аб працоўных дасягненнях, улічваючы спецыфіку лясной справы. Адметная рыса прафесіі лесавода — яе скіраванасць у будучыню. Бо лясы ствараюць адны, а «ўраджай» праз 80—100 гадоў збіраюць іншыя. І калі праз дзесяцігоддзі вырасце здаровы, якасны лес для нашчадкаў — гэта будзе самае галоўнае працоўнае дасягненне. Таксама хацелася б падзякаваць нашаму калектыву за працавітасць, зладжанасць у рабоце і падтрымку. Наша невялікае, але выніковае дасягненне — гэта 1-е месца ў абласным аглядзе-конкурсе на найлепшае добраўпарадкаванне сярод лясніцтваў лесагаспадарчых устаноў Мінскага ДВЛГА ў 2021 годзе.

А асабістае — тое, што бацькі ганарацца мной.

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота з асабістага архіва Алесі КАЗАК.

Нататкі шматдзетнага таткі

Восем пельменяў — ідэальная колькасць

На працягу апошніх чатырох месяцаў — з самага пачатку маёй работы на «аддаленцы» — мы з сынам жылі ў кватэры ўдваіх, у той час як усе астатнія члены сям'і жылі за горадам.

І кожная раніца ў нас пачыналася аднолькава.

Сын заходзіць да мяне ў пакой і кажа сонным басам:

— Добрай раніцы, тата.

— Прывітанне, сын.

Пасля чаго адбываецца даслоўна наступны дыялог:

— Пельмені будзеш?

— Буду.

— Колькі?

— Восем штук.

І сын ідзе варыць пельмені. Ні разу за ўсе гэтыя месяцы ён не пацікавіўся, чаму менавіта восем? Ці то яму гэта нецікава (што хутчэй за ўсё), ці то ён разумее: тата ведае, што кажа.

Але, тым не менш, кожны раз ён задае пытанне. І правільна, дарэчы, робіць, таму што тата можа раптам захацець больш ці менш пельменяў, таму лепш пацікавіцца загадзя.

Дык чаму ўсё ж такі восем, спытаеце вы? Ну, па-першае, я ў прынцыпе не ем пельмені на сняданак. Не люблю. Але калі жонкі няма дома, а самому гатаваць лянота, то адмаўляцца ад прапановы сына проста недальнабачна. Адзін раз адмовішся — і больш ён не прапануе. Давядзецца потым кожную раніцу бегаць за ім і прыніжацца: «Сынок, звары татку восем пельменяў, калі ласка!»

Ну а калі гаварыць чыста па-філасофску, то восем — гэта лік дасканаласці, таму восем пельменяў — ідэальная колькасць для таго, каб, з аднаго боку, не пераесці, а з іншага — дацягнуць да наступных пельменяў, на гэты раз на абед.

***

Кожны раз перад тым, як нацягваць абутак — няважна: чаравікі, сандалі або боты, — малодшая дачка абавязкова пытаецца ў каго-небудзь старэйшага па ўзросце, узяўшы ў рукі чаравік і спрабуючы нацягнуць яго на адну з ног: «На гэтую?»

І чамусьці заўсёды надзявае не на тую.

А калі гаворыш ёй: «Не, Ксенія, на другую», яна цяжка ўздыхае, мяняе нагу на правільную, пасля чаго... ставіць чаравік на падлогу, бярэ другі і ў поўнай упэўненасці, што цяпер усё як трэба, спрабуе нацягнуць.

І толькі пасля таго, як ты кажаш ёй канкрэтна: «Вось гэты чаравік надзявай на гэту нагу», яна ўсё робіць правільна.

Спачатку я думаў, што гэта выпадковасць, потым вырашыў, што проста здзекуецца, а цяпер, нарэшце, разумею: такім чынам дзіця вучыць дарослых даваць дакладныя ўказанні. І пакуль дарослыя гэтаму не навучацца, яна так і будзе надзяваць левы чаравік на правую нагу і наадварот.

У выніку дайшло да таго, што я цяпер сам, калі абуваюся, спачатку ўважліва гляджу на абутак і на свае ногі, потым стаўлю патрэбны чаравік каля патрэбнай нагі, пасля чаго асцярожна надзяваю.

Часам, калі ў мяне з'яўляюцца сумненні наконт адпаведнасці нагі чаравіку, я ціха пытаюся сам у сябе: «На гэту нагу?» і адказваю: «Так, на гэту» альбо кажу дакладна: «Памяняй нагу, Паша, чаравік пакінь той жа».

І магу з гонарам сказаць, што яшчэ ні разу (!) не выходзіў з дому няправільна абутым.

***

Усё-такі сучасныя тэхналогіі не такая ўжо шкодная рэч, часам бывае ад іх і карысць.

Купілі сёння на рынку ў Заслаўі пляжныя шлёпанцы для двайняткаў. У былыя часы купілі б і купілі. А сёння перад тым, як купляць, пазванілі ім на тэлефон, расказалі, якой афарбоўкі ёсць шлёпанцы, скінулі фотаздымкі ў «Вайбер» і толькі пасля таго, як дзеці вызначыліся з колерамі, купілі Веры блакітныя, а Полі — фіялетавыя.

Прыехалі (а мы цяпер за горадам жывём), малодшая ўбачыла шлёпанцы сясцёр і пачала румзаць, што таксама хоча такія. Спрабавалі ёй растлумачыць, што мы ёй не так даўно ўжо купілі шлёпанцы, проста яны знаходзяцца дома, у Мінску. Але яна заявіла, што нічога не памятае, і стала раўці яшчэ больш.

У выніку не заставалася нічога іншага, як патэлефанаваць сыну ў Мінск, папрасіць яго тэрмінова сфатаграфаваць шлёпанцы Ксеніі і адправіць нам у «Вайбер». Сын, які быццам і прывык да самых розных цудаў, доўга не мог уцяміць, навошта фатаграфаваць шлёпанцы.

І толькі калі мы паказалі Ксеніі фотаздымак яе шлёпанцаў, яна, нарэшце, супакоілася і... загадала тэрміновае ёй іх прывезці.

А вось тут, на жаль, новыя тэхналогіі злёгку падвялі, паколькі яны дазваляюць умомант даставіць фота шлёпанцаў, а вось каб даставіць іх самі, тату трэба ехаць у Мінск асабіста.

Таму прыйшлося даць сыну-фізіку тэрміновае заданне распрацаваць спосаб імгненнай дастаўкі прадметаў з пункта А у пункт Б. Тое, што ён распрацуе, я не сумняваюся, а вось што з намі бясплатна падзеліцца — не факт.

Думаю, на дадзеным этапе развіцця тэхналогій будзе танней і прасцей зганяць па шлёпанцы ў Мінск.

Павел ХОЛАД.

ООО «Деловая оценка»
(организатор аукциона) по поручению
ЗАО «Завод пластиковой упаковки» (продавец)
извещает о проведении 4 октября 2022 года
открытого аукциона по продаже имущества
в 11.00 по адресу: Гомельская обл.,
г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42			
1	Биогазовая электростанция (электрогенератор) Weukesha H24 GLD-200, 2007 год выпуска, серийный номер C17231/1	530 400,00	53 040,00
2	Вырубной штамп производство Германия	1 104,00	110,40
3	Маркировочная машина	110 400,00	11 040,00
4	Линия по производству стаканчиков KL2SH KIEFEL, заводской № 3432/54	43 200,00	4 320,00
5	Машина для 6-ти цветной печати OMSO PC/55 AC, 1996 год изготовления, серийный номер APX0103 96	38 760,00	3 876,00
6	Машина печати на полистир. крышках VAN DAM DLC, серийный номер S102675	29 400,00	2 940,00
7	Устройство рукав этикеточный	132 000,00	13 200,00
8	Формопласт FORMO plast 235/80, 1981 год изготовления, серийный номер 5367	1 320,00	132,00
9	Экструдер ROTEX-40D производства «Kiefel», тип V12, серийный номер 0126	1 800,00	180,00
10	Термоформующая машина SPEEDY-BC, производитель – Италия, заводской номер RI236.96, год выпуска 1996	100 800,00	10 080,00

Продавец: ЗАО «Завод пластиковой упаковки», Гомельская область, г. Речица, ул. Сыдько, д. 115, пом. 11. Контактный телефон +375296555051.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 03.10.2022 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с пятипроцентным шагом. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Победитель торгов обязан: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

Открытое акционерное общество «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»,

местонахождение: 220007, г. Минск, ул. Володько, д. 20,

раскрывает информацию о том, что наблюдательным советом Общества 30.08.2022 (протокол № 8/2022) принято решение о внесении изменений в условия сделки, в совершении которой имеется заинтересованность аффилированных лиц:

вид сделки: внесение изменений в договор аренды транспортного средства без экипажа от 07.06.2022 № 03;

предмет сделки: автомобиль Audi A6 45 TFSI Quattro S tronic. модель 4A2A7Y, гос. номерные знаки 8140 CT-7, технический паспорт МАА 2285269, номер кузова WAUZZZF24KN11271; свидетельство о регистрации № МАА 2285269;

стороны сделки: ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» (Арендодатель) и ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» (Арендатор);

вносимые изменения: Арендная плата в период с 01.09.2022 по 31.12.2023 включительно в целом за предоставляемое по договору аренды транспортного средства без экипажа от 07.06.2022 № 03, заключенному с ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7», имущество устанавливается в размере 704,00 белорусских рублей, в том числе НДС по ставке 20 % в размере 117,33 рубля, в месяц.

Так, 35-гадовая гараджанка пералічыла на невядомыя рахункі 1550 рублёў, жадаючы інвеставаць і атрымліваць прыбытак.

Пацярпелая растлумачыла, што ў сацыяльнай сетцы знайшла аб'яву аб розыгрышы 50 тысяч долараў. Яе зацікавіла гэтая прапанова, і яна звязалася з мужчынам, ад імя якога была размешчана рэклама. У перапісцы ў Telegram ён патлумачыў, як зарабіць грошы на крыптавалюце, і прапанаваў стаць інвестарам. Жанчына пагадзілася з умовамі, перавяла на ўказаны мужчынам рахунак 100 долараў — і неўзабаве на сваю карту атрымала прыбытак у два разы большы за ўкладзеную суму. Паверыўшы ў «чарадзейную схему» заробку ў інтэрнэце, яна зноў пералічыла незнаёмцу грошы ў памеры 1550 рублёў. Пасля гэтага пацярпелай выплат больш не паступала, а псеўдаброкер перастаў выходзіць на сувязь.

Яшчэ адзін 38-гадовы маладзечанец зрабіў укладанне ў інтэрнэт-трэйдзінг і страціў без малога 2 тысячы рублёў.

Высветлілася, што мужчына ў месенджары патрапіў на профіль, дзе прапаноўвалі зарабіць на біржы. Па словах адміністратара канала, для гэтага трэба было інвеставаць пэўную грашовую суму, мінімальна 250 рублёў. Мужчына вырашыўся на ўклад і пералічыў грошы на ўказаны рахунак, пасля чаго атрымаў фотасправаздачу аб паспяховай здзелцы і выйгрышы сумы ў дзясяткі разоў большай. Але ў выніку вывесці «зароблены прыбытак» аказалася немагчыма: спачатку лжэброкеры запатрабавалі аплаціць 13-працэнтную камісію, затым пад падставай нібыта няправільнай аперацыі выманілі яшчэ адзін перавод 877 рублёў, і так да таго часу, пакуль мужчына не зразумеў, што ўсё гэта «развод» і абяцаны заробак ён ніколі не атрымае.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ваш кашалёк

«ХУТКІЯ ГРОШЫ» ДОРАГА АБЫХОДЗЯЦЦА

Каб пазычыць грошы ў банку, неабходна адпавядаць шэрагу крытэрыяў. Ды і час патрабуецца на рашэнне ўсіх фармальнасцяў. Прасцей кажучы, банкаўскія паслугі не ўсім падыходзяць. Калі тэрмінова патрэбныя грошы, некаторыя бачаць альтэрнатыву ў атрыманні пазыкі ў мікрафінансавай арганізацыі або ў ламбардзе. Пра што трэба ведаць, разлічваючы хутка і лёгка атрымаць грошы ў якасці пазыкі?

МАКСІМАЛЬНЫЯ ПРАЦЭНТЫ

Рэклама мікрафінансавых арганізацый, як той казаў, на кожным слупе. Часам у аб'явах пішуць адкрытым тэкстам: калі ў вас дрэнная крэдытная гісторыя, вам — да нас. На першы погляд, пазыка прадастаўляецца без усякай бюракратыі — патрэбен толькі пашпарт, ды і па працэнтах быццам бы выгадна. Але «д'ябал крыецца ў дэталях», а менавіта ў праслаўтым дробным шрыфце дагавора. Ды і сам ён складзены так, што без вышэйшай эканамічнай адукацыі разабрацца немагчыма. А калі дадаць да гэтага, што звяртаюцца ў мікрафінансавыя арганізацыі людзі праблемныя, якія маюць дрэнную крэдытную гісторыю, не маюць «белага» заробку і не ўмеюць планаваць свае выдаткі, то і разбірацца ў літарах яны не будуць, а пачуюць толькі тое, што ім падабаецца. Гэтым і карыстаюцца работнікі мікрафінансавых арганізацый. Колькасць гісторый аб тым, калі чалавек афармляў пазыку на 1000 рублёў, а павінны 5000, ужо пераваліла за крытычную адзнаку. Не дзіўна, бо стаўка ў такіх арганізацыях даходзіць да 100 % гадавых. А яшчэ ўсялякага роду штрафныя санкцыі.

Сто разоў трэба падумаць, перш чым так зрабіць: тэлефанаваць будуць кожную гадзіну, удакладняючы, калі ж вы прыйдзеце па пазыку.



Рэагуюць на праблему і супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю, дзе нядаўна прайшла «гарачая лінія» па пытаннях дзейнасці лізінгавых і мікрафінансавых арганізацый. Вось якія рэкамендацыі даў **начальнік упраўлення кантролю банкаўскай дзейнасці і фінансавых рынкаў КДК Андрэй ФЁДАРАЎ**: «Памятайце, што бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Тым, хто звяртаецца ў мікрафінансавыя арганізацыі, трэба шматразова падумаць, перш чым узяць гэтыя грошы. І як бы вас ні прыспешвалі, вывучайце дагавор не спяшаючыся. Вы — спажывец фінансавых паслуг, вы павінны дакладна разумець, пра што ідзе гаворка. Калі нічога не зразумелі, не падпісвайце. Большасць людзей, якія трапілі ў непрыемныя фінансавыя сітуацыі, гавораць: мне так сказалі, мяне пераканалі. Але ўсе ўмовы выкладзены ў дагаворы. Слова да справы не прышыеш. Калі справа дойдзе да суда, вусныя абяцанні не маюць ніякай сілы».

Супрацоўнікі КДК праводзяць кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы, у тым ліку адносна мікрафінансавых арганізацый. Таксама Камітэт дзяржкантролю і Нацыянальны банк займаюцца карэкціроўкай заканадаўства. «Уносяцца навацыі, якія абмяжуюць апетыты мікрафінансавых арганізацый. Цяпер на ўзгадненні знаходзіцца праект Банкаўскага кодэкса, які абмяжоўвае патрабаванні банкаў у частцы штрафных санкцый і адказнасці крэдытаатрымальнікаў. Аналагічная работа вядзецца і з мікрафінансавымі, лізінгавымі арганізацыямі, — цытуе БелТА Андрэя Фёдарава. — Важна, каб сума адказнасці не перавышала шматразова суму пазыкі. Працуем таксама над тым, каб яны не маглі прывязваць плацяжы да курса долара, таму што фактычна ўся валютная рызыка перакладваецца на фізічную асобу і пры змене курса чалавек можа трапіць у пастку».

Колькасць гісторый аб тым, калі чалавек афармляў пазыку на 1000 рублёў, а павінны 5000, ужо пераваліла за крытычную адзнаку.

Мікрафінансавыя арганізацыі не толькі вешаюць аб'явы на слупы, але і маюць сайты. Здавалася б, усё цывілізавана, ёсць нават калькулятар: укажыце суму, адзначце, якія ў вас праблемы (беспрацоўны або дрэнная крэдытная гісторыя і інш.), і мы на ваш тэлефон дашлём усю інфармацыю. Сто разоў трэба падумаць, перш чым так зрабіць: тэлефанаваць будуць кожную гадзіну, удакладняючы, калі ж вы прыйдзеце па пазыку.

ЯК ПАМЯНЯЦЬ АЙФОН НА ГРОШЫ?

Другі варыянт хутка атрымаць пазыку — звярнуцца ў ламбард. Але трэба мець рухомую маёмасць для закладу. Дарэчы, ламбарды былі і ў часы СССР, зразумела, дзяржаўнай формы ўласнасці. А ў пачатку 1990-х такую дзейнаць мог весці і прыватны бізнес. Заўважана, што найбольш з'яўляецца ламбардаў, калі пагаршаецца эканамічнае становішча насельніцтва.

У нашай краіне ёсць як спецыялізаваныя ламбарды, якія працюць з абмежаваным відам закладу, напрыклад з каштоўнымі металамі або аўтамабілямі. Ёсць і ўніверсальныя, якія прымаюць шмат розных відаў закладу. Зрэшты, ва ўсіх адзін прынцып: працаваць толькі з ліквідным таварам. Многія ламбарды аддаюць перавагу малагабарытным рэчам.

Між іншым, у ламбард лепш не несці таннае золата, прывезенае з папулярных курортаў, — яно не вытрымлівае праверкі рэактывамі. Таксама таваразнаўцы ламбардаў умеюць адрозніваць брэндавыя гаджэты ад падробак.

Кліентамі ламбарда могуць быць толькі тыя, каму споўнілася 18 гадоў. Пры афармленні здзелкі складаецца дагавор і выдаецца закладны білет. У апошні ўносяцца звесткі аб ламбардзе і кліенце; уся інфармацыя аб закладзе; сума, якая выдадзена кліенту; працэнтная стаўка і дата пагашэння доўгу.

Усе ламбарды маюць сайты, таму папярэдне варта іх наведаць. Напрыклад, можа адрознівацца працэнтная стаўка, часам ладзяцца акцыі. Але ёсць і агульныя правілы: вырабы з каштоўных металаў прымаюцца па кошце лому. Нават за новую рэч у ламбардзе не прапануюць 100 % яе кошту, у найлепшым выпадку 70 %, а то і 40 %.

Калі кліент не выкупіў свой заклад у дамоўленыя тэрміны, апошні захоўваецца ў ламбардзе каля месяца. Затым тавар выстаўляецца на продаж, а каштоўныя металы прадаюць у Дзяржсхоў. Пакуль рэч захоўваецца, яе можна выкупіць, заплаціўшы працэнты за пратэрмінаваны час.

Прапаноўваючы ў заклад аўтамабіль, кліент можа працягваць ім карыстацца, але, натуральна, памятаючы аб абцяжаранні.

Варта ведаць і пра такі нюанс. Звесткі пра кліентаў, якія афармляюць пазыку з наступным выкупам закладу, падаюцца ў крэдытны рэгістр. Гэта значыць, у далейшым факт звароту ў ламбард будзе ўлічвацца ў крэдытнай гісторыі. Калі кліент упэўнены, што не зможа ці не хоча вяртаць заклад, то ламбард можа адразу яго выкупіць. У гэтым выпадку работнікі ламбарда не абавязаныя ўносіць даныя кліента ў крэдытны рэгістр. Але гэты момант трэба ўдакладняць, бо «не абавязаны» — не значыць «не будуць».

Ці выгадна здаваць рэчы ў ламбард? Напрыклад, на сайце аднаго з ламбардаў ёсць прыклады закладу, сума пазыкі і пераплаты. За брэндавы гадзіннік выдадзена пазыка на сем дзён у памеры 250 рублёў. Праз тыдзень кліент павінен ламбарду 260,50 рубля, гэта значыць пераплата за адзін дзень складае 1,50 рубля.

Між іншым, у ламбард лепш не несці таннае золата, прывезенае з папулярных курортаў, — яно не вытрымлівае праверкі рэактывамі.

На сайце аднаго з банкаў прапануецца спажывецкі крэдыт без даведак і паручыцеляў. Мінімальная сума крэдыту — 500 рублёў, тэрмін пагашэння выбралі 12 месяцаў, у кожны з якіх банку трэба вяртаць 46,98 рубля. Такім чынам, за карыстанне 500 рублямі давядзецца заплаціць 63,76 рубля, гэта значыць 17 капеек у дзень. Відавочна, што банкаўскі крэдыт абыходзіцца танней, чым пазыка ў ламбардзе і мікрафінансавай арганізацыі. Але ці карэктна параўноўваць лічбы, калі ўмовы атрымання моцна адрозніваюцца?

Можна толькі пажадаць нам усім добрых заробкаў і высокай фінансавай адукаванасці, каб пры неабходнасці пазыкі была магчымасць атрымаць яе на самых выгадных умовах.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже имущества

Белорусского республиканского союза потребительских обществ

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2022.Ч.002.00095** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

Продавец: Белорусский республиканский союз потребительских обществ 220004, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, д. 17, комн. 409, тел. +375 (17) 311 38 17.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения электронных торгов 03.10.2022 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. 4593/9163 доли в праве на кап. строение с инв. № 500/С-31904, наименование – цех по производству контейнеров, назначение – здание неустановленного назначения, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 64/1. 4593/9163 доли в праве собственности на кап. строение составляют 4593 кв. м. Общая площадь кап. строения 9 163 кв. м. В состав лота входит следующее движимое имущество: оградительная перегородка 18200*2800 мм (инв. № 9000003), лебедка с каркасом 1500*1500 мм TOR KCD 1000 T21 (инв. № 9000004), вентиляционная установка В-2 (инв. № 9000002), ворота откатные 3400*3000 (инв. № 9000005), металлический забор 2000*1000 (инв. № 9000006), тепловентиляторы вод. КЭВ-106Т4W2 с водяным калорифером (инв. № 9000007, 9000008, 9000009), тепловентиляторы вод. КЭВ-40Т3,5W3 в комплекте с ПУ (инв. № 90000011, 90000012), вентиляционная установка В-1 (инв. № 80000035), кран-балка (инв. № 90000013), тельфер 3,2 т (инв. № 90000014), электротельфер г/п 2 т «Колядичи» с кран-балкой (инв. № 90000015), жалюзи – роллеты 3085*3205 (инв. № 90000019), навес для участка производства стеклопакетов (инв. № 9000001), навес – склад для мебельного участка (инв. № 90000020), навес – склад для механического участка (инв. № 90000021), перегородка 11080*3500 мм (инв. № 90000033). Движимое имущество находятся по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 64/1.

Обременения и ограничения: площади здания сданы в аренду. Договор аренды от 23.12.2020 № 547 сроком до 31.12.2022. В состав лота не входят трансформаторные подстанции, установленные внутри здания.

Нач. цена: 1 803 862,32 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

Задаток: 180 386,23 бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по электронным торгам: **до 16.00 30.09.2022**.

Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Код операции: 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Условия электронных торгов: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; расходы Продавца на проведение независимой оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 15 (пятнадцати) раб. дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в следующем порядке: если между продавцом и покупателем (победитель торгов либо претендент на покупку) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, оплата за предмет электронных торгов должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Расходы Доверителя на проведение независимой оценки составляют 1833,63 бел. руб., в том числе:

доли 4593/9163 в праве на кап. строение с инв. № 500/С-31904: 693,63 бел. руб. с учетом НДС 20 %; основных средств и оборудования: 1140,00 бел. руб. без учета НДС (УСН).

С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе «Недвижимость».

Имущество, бывшее в употреблении. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Бельский Павел Игоревич, тел. +375297006645.

УНП 600097530

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

Номер лота Место-нахождение земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Началь-ная цена, рублей
Лот № 1 **РИЗ «Аэропорт» к. п. Нарочь, У-21**	**0,1312**	**624083390 501000028**	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения (размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) с объектами обслуживания)	**15500**
Дата, время и место проведения аукциона	**30 сентября 2022 г. в 11.00** аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (зал заседаний), Нарочский сельский исполнительный комитет			
Извещение опубликовано	Официальный сайт Минского облисполкома www.minsk-region.gov.by (http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/zemelnye-uchastki-v-chastnuyu-sobstvennost-01/) Официальный сайт Государственного комитета по имуществу gki.gov.by (https://au.nca.by/search) Официальный сайт Мядельского райисполкома http://myadel.gov.by/ru/sformirovan-ru/			

Просим **считать недействительным** страховой полис ОСГО ВТС РБ серии МА № 3097959 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **в связи с его утерей.**

УНП 100357923

Антикризисный управляющий общества с ограниченной ответственностью «Белросмясснаб» – индивидуальный предприниматель Казак Ольга Сергеевна (организатор торгов) извещает о проведении 03.10.2022 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 215 первых открытых торгов по продаже дебиторской задолженности общества с ограниченной ответственностью «Белросмясснаб»:

№	Наименование дебитора	Начальная цена, бел. рублей
1	Общество с ограниченной ответственностью «МОСТик»	12 988,18 BYN
2	Общество с ограниченной ответственностью «Мясокомбинат Георгиевский»	201 562,71 BYN
3	Общество с ограниченной ответственностью «РосБелБарака»	25 300,00 BYN
4	Частное предприятие «Мит экспорт»	2 488,82 BYN
5	Республиканское унитарное предприятие «Белоруснефть-Особино»	1 017,03 BYN
6	ИП Васягин Владимир Евгеньевич	1 696,00 BYN
7	Общество с ограниченной ответственностью «Аль-Мусави»	536,37 BYN
8	Общество с ограниченной ответственностью «Армастек»	883,94 BYN
9	ИП Бабакулов Непес Сейитмурадович	696,08 BYN
10	Общество с ограниченной ответственностью «БелМанэро»	1 695,00 BYN
11	Общество с ограниченной ответственностью «БонаПай»	8 944,84 BYN
12	ИП Васильков Игорь Петрович	1 202,30 BYN
13	Общество с ограниченной ответственностью «ВМС СЕРВИС»	1 206,20 BYN
14	ИП Вяткин Владимир	4 999,50 BYN
15	ИП Дьячек Марина Михайловна	436,15 BYN
16	Общество с ограниченной ответственностью «Зыба-Ретро»	205,59 BYN
17	Общество с ограниченной ответственностью «ИзиФуд»	262,30 BYN
18	ИП Канаш Алла Леонидовна	663,00 BYN
19	ИП Ковалевский Александр Александрович	4 314,75 BYN
20	ИП Красногир Юрий Павлович	2 160,15 BYN
21	ИП Макаревич Денис Янович	400,00 BYN
22	ИП Малашенко Дмитрий Владимирович	2 866,38 BYN
23	ИП Махкамов Умеджон Раджабович	1 600,00 BYN
24	Общество с ограниченной ответственностью «МашиноИмпортБел»	1 801,80 BYN
25	Общество с ограниченной ответственностью «МВ фэктори»	1 088,34 BYN
26	Открытое акционерное общество «Минский мясокомбинат»	673,31 BYN
27	ИП Назаров Дмитрий Владимирович	1 993,35 BYN
28	ИП Низгуренко Тахир Евгеньевич	226,00 BYN
29	Общество с ограниченной ответственностью «Новый аргумент»	457,89 BYN
30	Общество с ограниченной ответственностью «Одови»	207,90 BYN
31	Общество с ограниченной ответственностью «Панкрат и КО»	273,90 BYN
32	ИП Прангулашвили Дато	401,10 BYN
33	Общество с ограниченной ответственностью «Прияншу Глобал»	3 853,26 BYN
34	Общество с ограниченной ответственностью «Продукты ЦК»	674,90 BYN
35	ИП Процкий Игорь Олегович	415,80 BYN
36	ИП Романова Юлия Сергеевна	922,25 BYN
37	ИП Столяров Михаил Вячеславович	2 010,14 BYN
38	Общество с ограниченной ответственностью «ТаКоСервис»	1 126,60 BYN
39	Частное унитарное предприятие по оказанию услуг «Триклим»	331,85 BYN
40	Общество с ограниченной ответственностью «ФастТэсти»	2 640,41 BYN
41	Общество с ограниченной ответственностью «ФудЛаб»	3 219,85 BYN
42	Общество с ограниченной ответственностью «Хармаэль»	5 837,30 BYN
43	Общество с ограниченной ответственностью «Эффективные АгроТехнологии»	1 000,35 BYN

Условия приема заявлений и прилагаемых к ним документов: прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 3, с даты настоящей публикации по 30.09.2022.

Сумма шага аукциона: шаг аукциона (5 % от цены лота): 15 364,08 BYN.

Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним: предмет торгов – дебиторская задолженность ООО «Белросмясснаб».

Ознакомиться с документами можно по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5/215, предварительно согласовав с представителем управляющего по тел. 8 029 6 39 77 91.

Сведения о продавце, его контактные телефоны: ООО «Белросмясснаб», тел. 8 029 6 39 77 91.

Сведения об организаторе торгов, его место нахождения и контактные телефоны: антикризисный управляющий ООО «Белросмясснаб» – индивидуальный предприниматель Казак Ольга Сергеевна, г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 215, 2-й этаж, тел. 8 029 639 77 91.

Место нахождения предмета торгов: г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 5, каб. 215.

Размер, порядок и сроки внесения суммы задатка, необходимые реквизиты текущего (расчетного) банковского счета продавца, на который должна быть перечислена сумма задатка: задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота: 15 364,08 BYN. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 3, с даты настоящей публикации по 30.09.2022 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 30.09.2022 г. на р/с ООО «Белросмясснаб» BY58ALFA30122156400090270000 в ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X, УНП 691817905.

Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются участником, выигравшим торги. Участие в торгах оформляются итоговым протоколом в день их проведения. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимся в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 13 сентября 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42			
1	Четырехцветная флексографическая машина с сушками УФ (UV) лучей, коронатором и ракельными ножами	7 632,00	763,20
2	ПВЭМ «LinkT», инв. № 2928	28,80	2,88
3	Монитор Philips 227E3L PHSU, инв. № 2939	17,04	1,70
4	Многофункциональное устройство HP LJ Pro M1536dnf CE538A, инв. № 3303	50,40	5,04

Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.

Контактный телефон +375 29 655 50 51.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12.09.2022 г. в 17.00. Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЧЕТВЕРТЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00093

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении четвертых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Новополоцкому обществу с ограниченной ответственностью «Мастак», УНП 300515730, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 152Б21225 в экономическом суде Витебской области

Номер лота, вид выставляемого на четвертые повторные электронные торги имущества:

Лот № 1: недвижимое имущество.

Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:

Изолированное помещение с инв. № 250/D-36474 площадью 1127,4 кв. м, наименование – помещение многофункциональное, назначение – помещение многофункциональное, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68-4. Изолированное помещение с инв. № 250/D-36634 площадью 197,4 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68-1, составные части и принадлежности: уборная, мощение (асфальтобетонное и бетонное), ограждение (проволочное), ворота, ограждение (бетонные плиты), калитка, бордюр. Капитальное строение с инв. № 250/C-32928 площадью 852 кв. м, наименование – навес, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68.

Капитальное строение с инв. № 250/C-32919, наименование – линии наружного освещения, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность сооружения – 1959,5 м, из них кабеля – 1697,0 м и провода – 262,5 м, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68.

Капитальное строение с инв. № 250/C-32923, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики, протяженность сооружения – 65,5 м. по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68. Капитальное строение с инв. № 250/C-32920 наименование – водопроводная сеть (противопожарная), назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, протяженность сооружения – 719,6 м, составные части и принадлежности: резервуары запаса воды № 1, № 2, № 3, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68. Вышеуказанное имущество находится на земельном участке с кадастровым № 243500000005000037 площадью 1,3868 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68, назначение – для использования под производственную базу (право постоянного пользования, доля – 17/25). Капитальное строение с инв. № 250/C-32924, наименование – водопроводная сеть внеплощадочная, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, протяженность сооружения – 307 м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Тросницкая, пер. Тросницкий 1-й, пер. Осипенко, ул. Лазо. Капитальное строение с инв. № 250/C-32926, наименование – подъездная автодорога, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, площадь – 1155,0 кв. м, протяженность сооружения – 126,5 м, материал покрытия – бетон, по адресу Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, д. 68, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть. Кап. строение с инв. № 250/C-32926 находится на следующих земельных участках: зем. участок с кадастровым № 243500000005001761 площадью 0,0206 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68, назначение – для содержания и обслуживания проезда через железнодорожный переезд к производственной базе (право постоянного пользования) и зем. участок с кадастровым № 243500000005001760 площадью 0,1643 га по адресу Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Суворова, 68, назначение – для содержания и обслуживания проезда через железнодорожный переезд к производственной базе (право постоянного пользования).

Начальная цена: 133 404,81 бел. руб. без НДС.

Минимальная цена: 66 702,40 бел. руб. без НДС.

Условия четвертых повторных электронных торгов: Победитель электронных торгов (единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, расходы по проведению независимой оценки, и услуги оператора ЭТП согласно Прейскуранту ЭТП, подписать договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить предмет торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: нет.

Дата и время начала и завершения четвертых повторных электронных торгов: 16.09.2022 с 9.00 до 16.00.

Четвертые повторные электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by/.

Для участия в четвертых повторных электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до **16.00 15.09.2022.**

Задаток по лоту № 1 в сумме **13 340,48** (тринадцать тысяч триста сорок рублей 48 копеек) белорусского рубля должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК МТВКBY22, код операции 40901.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Справочная информация:

Контактные телефоны антикризисного управляющего: +375 (29) 680-72-22, +375 (29) 166-85-33.

Контактный телефон для осмотра объектов +375 (29) 135-39-70.

Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов): в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения предмета электронных торгов по предварительному согласованию с Продавцом.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат и прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производятся на http://etpvit.by/ до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ

ОРГАНИЗАТОР: *ЛУКОМЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ЧАШНИКСКОГО РАЙОНА ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ*

№ лота	Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение	Площадь (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб.	Начальная цена, руб.	Сумма задатка 10 %, руб.
1	Витебская обл., Чашникский р-н, д. Абузерье, ул. Дачная, 5У	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	0,2474	225183000101000257	1715,81	6 000,00	600,00

Условие проведения аукциона:

Наличие не менее двух участников.

Заключение с Лукомльским сельским исполнительным комитетом соглашения.

Победителю аукциона, либо в случае признания аукциона несостоявшимся единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность:

- возместить затраты, связанные с проведением аукциона;

- внести плату за земельный участок.

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории:

подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД

Аукцион состоится **3 октября 2022 г. в 15.00** по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

Заявления и пакет необходимых документов представляются участниками с 8.00 до 17.00 со дня опубликования настоящего извещения и до **27 сентября 2022 г.** включительно по адресу: аг. Лукомль, ул. Максима Горького, 9, Лукомльский сельисполком.

1. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка. Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, а представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет р/с BY68AKBB3641 3290522002200000 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300986851, код платежа 4901, получатель – Лукомльский сельский исполнительный комитет.

Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактные телефоны: 8 (02133) 6 41 45, 6 05 30.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ АУКЦИОНА, назначенного на 08.09.2022 г.

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/C-52817 (назначение – здание специализированное складов, хранилищ, наименование – здание склада), площадью 806,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28А

УНП 500015698

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Навошта саджаць часнок «бульбачкамі»

Шматлікія садоўнікі прывыклі саджаць часнок зубкамі і іншага спосабу не ўяўляюць. Але можна ў якасці пасадачнага матэрыялу выкарыстоўваць яго «бульбачкі».

1. Эканоміцца пасадачны матэрыял, калі часнок буйны і ў цыбуліне змяшчаецца 4-5 зубкоў, лепш спажыць іх у ежу, чым саджаць.

2. Аздараўляецца пасадачны матэрыял, бо «бульбачкі» не сутыкаюцца з зямлёй, а значыць не пераносяць магчымыя хваробы.

3. Амаладжэнне: пры кругавароце пасяўнога матэрыялу, праз 4-5 гадоў у часнаку назапашваюцца хваробы, а «бульбачкі» ўтвараюцца на кветаложы, там дзе павінна ўтварацца насенне і з'яўляюцца чыстымі ад хвароб, якія перадаюцца вегетатыўна.

«Бульбачкі» атрымліваюць, пакідаючы выспяваць стрэлкі на раслінах часнаку. Для гэтага дастаткова пакінуць усяго 2-3 стрэлкі. Збіраць іх трэба, калі стрэлка цалкам выпрасталася і абалонка трэснула.

Высейваюць «бульбачкі» ў другой палове верасня, для таго каб яны паспелі ўтварыць карэньчыкі для паспяховай зімоўкі, але не пачалі расці.

Сеюць «бульбачкі» па схеме: паміж радамі 20 см, у радзе — 3-4 см, глыбіня пасадкі 2-3 см.

У канцы наступнага года можна выкопваць «бульбачкі» і высаджваць як паўнавартасныя зубкі, а можна пакінуць расці на другі год, тады неабходна павялічыць адлегласць пры сеянні.

Анонс

...І ТОЛЬКІ ЧЫСТЫ ДАЛЯГЛЯД

У Выдавецкім доме «Звязда» працягваецца выданне паэтычных кніг, якія прадстаўляюць вершы найлепшых майстроў беларускага прыгожага пісьменства XX — XXI стагоддзяў. Толькі што здадзены ў друкарню зборнік «Адчыненая хаціна».

І хоць на кнігах няма пазнакі серыі, іх аб'ядноўвае агульная стылістыка афармлення. А яшчэ тое, што ўкладальнікам усіх зборнікаў з'яўляецца адзін з найцікавейшых пісьменнікаў сучаснасці — галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп. Цяпер ён узначальвае і секцыю паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі.

«Нібы з усіх шляхоў спакусных / Вярнуўся сэрцам акрыяць / Каля вытокаў, дзе пакуль што / Пустэльны бераг, Бог і я. / І ўжо няма балючых згадак, / Як век, як шмат вякоў назад. / І толькі босы след — пачатак, / І толькі чысты далягляд». (Алесь Каско). «Жыла ўва мне мара адна: / За яваю следам гарачым / Ісці, дабірацца да дна, / Усё да канца растлумачыць» (Іван Арабейка). «Я сваё пражыву і растану, як дым, / А як скоціцца з неба іскрынка, / Знак падам, што з'явілася ў родзе маім, / Бы ў рацэ, залатая пясчынка. / Непрыкметная аблізку, заззяе яна / Светляком над прыціхлай зямлёю, / І я буду глядзець на яе давідна, / Назаўжды неразлучны з раднёю». (Васіль Сахарчук). Тры яркія паэты прадстаўлены ў кнізе, укладзенай Віктарам Шніпам, — Алесь Каско, Васіль Сахарчук, Іван Арабейка. Іх унутраны свет, іх мастацкія вобразы і сімвалы — сведчанне глыбокага пранікнення ва ўнутраны свет сучасніка, незвычайнай сілы жаданне паяднаць чалавека і яго родны кут у адно цэлае, зрабіць родныя вобразы галоўным пунктам прыцягнення ў жыцці. Можа быць, і гэты зборнік «Адчыненая хаціна» нагадае айчынным крытыкам, літаратуразнаўцам, што і пра іх творчасць, творчасць аўтараў з глыбінкі, яшчэ варта сказаць шмат добрых слоў.

Раней у Выдавецкім доме «Звязда» ўбачылі свет паэтычныя кнігі Анатоля Сыса, Леаніда Дранько-Майсюка, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Алеся Бадака, Віктара Шніпа, а таксама калектыўны зборнік паэтаў Гродзеншчыны, дзе пад адной вокладкай былі прадстаўлены творы Міхася Васілька, Юркі Голуба, Мар'яна Дуксы.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

Даты Падзеі Людзі

1 ВЕРАСНЯ

Дзень Руху недалучэння. 1—6 верасня 1961 года ў Бялградзе адбылася першая канферэнцыя кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў краін, якія не далучыліся ні да аднаго з ваенна-палітычных саюзаў. У 1998 годзе Беларусь стала 114-м членам Руху недалучэння.

У краіне

1853 год — нарадзіўся Міхаіл Федароўскі, фалькларыст, этнограф і археолаг, калекцыянер. У 1877—1904 гадах жыў у Заходняй Беларусі. Даследаваў духоўную і матэрыяльную культуру, збіраў кнігі, гістарычныя дакументы старажытных магнацкіх архіваў, матэрыялы для археалагічнай карты дагістарычнай Беларусі. Сабраў каля 5 тысяч беларускіх народных песень, больш за 10 тысяч прыказак, прымавак, сотні казак, загадак, народных павер'яў, парад па народнай медыцыне. Фальклорныя запісы вучонага, апісанні быту беларусаў, каляндарных і сямейных абрадаў, якія ўвайшлі ў сямітомную работу «Народ беларускі», захоўваюцца ў Рукапісным аддзеле бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта, у навуковым архіве Польскага этнаграфічнага таварыства ў Вроцлаве.

1906 год — у Вільні выйшла «Наша доля» — першая легальная газета на беларускай мове.

1928 год — кінааргінізацыяй «Белдзяржкіно» ў Санкт-Пецярбургу створана кінастудыя «Савецкая Беларусь» (з 1939 года — у Мінску), з 1946 года — «Беларусьфільм». У 1930 годзе з кінастужкі «Пераварот» (рэжысёр Ю. Тарыч) пачалася вытворчасць гукавых фільмаў. У 1954-м на студыі створаны першы каляровы мастацкі фільм «Дзеці партызана» (рэж. Л. Голуб, М. Фігуроўскі). У 1971-м створаны першы шырокафарматны фільм «Крушэнне імперыі» (рэжысёр У. Корш-Саблін).

1952 год — нарадзіўся (в. Ордаць Шклоўскага раёна) Міхаіл Якаўлевіч Паўлаў, беларускі дзяржаўны дзеяч, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2000, 2004), старшыня Мінскага гарвыканкама (2000—2009).

1992 год — адкрыты Чэрвеньскі раённы краязнаўчы музей. Сярод экспанатаў — археалагічныя знаходкі XIII ст. з гарадзішчаў каля вёсак Турэц і Гарадзішча, матэрыялы пра вайну 1812 года, паўстанне 1863—1864 гадоў, прадметы сялянскага быту і прылады працы рамеснікаў XIX — пачатку XX ст., фотаздымкі, дакументы, асабістыя рэчы ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, Першай сусветнай і Грамадзянскай войнаў, Вялікай Айчыннай вайны. Таксама прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя знакамітым землякам.

У свеце

5509 год да н. э. — пачатак Канстанцінопальскай (Візантыйскай) эры, сістэма летазлічэння «Ад стварэння свету», якая праваслаўнымі тэолагамі адносілася да пятніцы — шостага дня стварэння.

1581 год — казачы атаман Ярмак Цімафеевіч сабраў атрад з 840 чалавек для зававявання Сібіры.

1712 год — місіянер Францыя Ксаўе д'Антрэколь, знаходзячыся ў Кітаі, таемна адправіў у Францыю ліст, у якім раскрыў сакрэт вырабу кітайскага фарфору. Так Еўропа атрымала тэхналогію яго вытворчасці.

Так гаварыў...

ЛАФАНТЭН:

«Цярпенне і час даюць больш, чым сіла ці страсць».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.17	20.00	13.43
Віцебск —	6.05	19.53	13.48
Магілёў —	6.07	19.51	13.44
Гомель —	6.07	19.45	13.38
Гродна —	6.33	20.15	13.42
Брэст —	6.36	20.13	13.37

Месяц

Маладзік 27 жніўня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Фёклы, Андрэя, Мікалая, Цімафея.*
К. *Браніславы.*

Фота Настассі ГРУК.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Фільм «50 спроб легчы спаць». У галоўных ролях: ноч, я, інтэрнэт, халадзільнік.

Калі б хамелеоны лепш рабілі сваю работу, мы б ніколі не даведаліся пра існаванне хамелеонаў.

СМС:

— Я вам спрабаваў перавесці 1000 рублёў, але ў мяне не атрымалася. Паспрабуйце вы мне, можа, у вас атрымаецца.

— Не, мы будзем сварыцца ў паведамленнях, таму што калі ты прыедзеш, я ўбачу цябе і мне захочацца абдымацца.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2263.

Нумар падпісаны ў 19.30 31 жніўня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12